

КАРУПЦЫЯ НЕ ПРОЙДЗЕ 7



ЧЫМ ЖЫВЕ САЮЗ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ 12–13

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. СУБОТА № 210 (30344)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ГЛАДКІ, начальнік упраўлення аўтамабільнага і гарадскога пасажырскага транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый:**

*«Адбываюцца даволі сур'ёзныя змяненні ў сферы перавозак пасажыраў і грузаў. Вялікую ўвагу ўдзяляем абнаўленню парка рухомага саставу. Пастаўлена даволі амбіцыйная задача па 10 працэнтах абнаўлення парка рухомага саставу, каб пасажыры маглі з камфортам перамяшчацца. Гэта дасць магчымасць на працягу 10 гадоў фактычна абнавіць увесь рухомы састаў. У бягучым годзе плануецца закупіць каля 600 аўтобусаў, каля 500 з іх пастаўлены ўжо. Таксама набываюцца электробусы, тралейбусы, трамваі».*

# Лётаць — гэта сямейнае



Учора ў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь адбыўся 26-ы выпуск лётчыкаў авіяцыйнага факультэта. Сярод выпускнікоў — лейтэнант Мікіта КАРПУНІН, малодшы з братоў у сям'і. Гэты ж факультэт у 2021 годзе скончыў Дзмітрый КАРПУНІН, а ў 2022 годзе — Арцём КАРПУНІН, якія цяпер у званні старшых лейтэнантаў. У сваім выбары прафесіі яны пайшлі па шляху бацькі.

Маці хлопцаў Таццяна КАРПУНІНА, якая таксама прыйшла павіншаваць Мікіту з заканчэннем вучобы, у званні маёра служыць у 1-м ваенным шпіталі органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь. Яна з гонарам расказвае, што ўнук Мацвей, якому нядаўна споўнілася два з паловай гады, таксама марыць быць ваенным лётчыкам, як тата.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў аўтамабільнага транспарту і дарожнай гаспадаркі з прафесійным святам — Днём аўтамабіліста і дарожніка.
- **ЦВК да 1 лістапада прымае дакументы для рэгістрацыі ініцыятыўных груп кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі.**
- Саюзныя парламентарыі прапаноўваюць устанавіць у СД сацгарантыі для ветэранаў працы і ганаровых донараў.
- **Больш за 100 муралаў на лесаахоўную тэматыку з'явіцца ў райцэнтрах Беларусі.**
- Мінск названы адным з самых папулярных напрамкаў палётаў з Санкт-Пецярбурга восенню.
- У Гродне абнаўляюць самы вялікі ў Беларусі ткацкі станок.

ISSN 1990 — 763X

24210

9 771990 763008

Размова па сутнасці

# Надзейны фундамент

### Эксперты абмеркавалі сацыяльныя гарантыі і духоўныя каштоўнасці, неабходныя для кожнай сям'і

**Колькі беларусаў лічаць сям'ю найважнейшай каштоўнасцю? Якія рэгіёны ў Беларусі самыя шматдзетныя? І колькі ў краіне сем'яў, дзе выхоўваецца трое і больш дзяцей? Чаму толькі ў сям'і магчымае гарманічнае развіццё чалавека? Чым сем'ям дапамагаюць у РНПЦ «Маці і дзіця» і чым каштоўная такая падтрымка? Гэта і іншае абмеркавалі эксперты падчас круглага стала, прысвечанага падвядзенню вынікаў конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава».**

### Самыя шматдзетныя — Брэсцкая і Мінская вобласці

**Алена КОМЛІК, кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны**, адзначыла, што для беларусаў сям'я мае высокую каштоўнасць: 98 % нашых суайчыннікаў лічаць яе найважнейшай часткай свайго жыцця. Сем'і мае каля 80 % насельніцтва краіны. Большасць беларусаў, як пацвярджаюць даследаванні, асацыююць сям'ю з дзецьмі.

Такім чынам, колькасць шматдзетных сем'яў на 1 кастрычніка бягучага года склала звыш 123 тысяч. Больш за ўсё іх жыве ў Брэсцкай (звыш 25 тысяч) і Мінскай вобласці (практычна 22 тысячы). Большасць шматдзетных сем'яў (80 працэнтаў) маюць траіх дзяцей. Аднак ёсць у краіне і ўнікальныя сем'і, якія выхоўваюць 10 і больш дзяцей. У лідарах — Брэсцкая вобласць, дзе пражываюць 16 такіх сем'яў, у Гродзенскай і Мінскай абласцях пражываюць па сем сем'яў з 10 дзецьмі. Самая вялікая шматдзетная сям'я ў краіне выхоўвае 15 дзяцей і жыве ў Мінскай вобласці.

СТАР. 5

Школьны мерыдыян

# КАНІКУЛЫ? КАНІКУЛЫ!

### Чым заняць дзяцей на канікулах

**Зусім нядаўна, вераснёўскай раніцай, мы выпраўлялі школьнікаў у краіну ведаў. Прайшло няшмат часу, і вось лістота змяніла афарбоўку, цёплыя курткі і шалікі — лёгкае адзенне, на вуліцы на ўсю моц уладарыць залатая восень, а ў школьных журналы паволі выстаўляюцца чацвяртныя адзнакі. Гэта значыць, што зусім хутка ў школьнікаў пачнуцца першыя ў навучальным годзе вакацыі. Васьмідзённы перадых — якраз тое, што трэба пасля першай адаптацыйнай чвэрці, калі яшчэ свежыя ўспаміны аб трохмесячнай вольніцы. Для першакласнікаў гэтая чвэрць і зусім стрэсавая: у іх жыцці пачаўся новы перыяд — з раскладам, дысцыплінай, з чужымі дарослымі і незнаёмымі дзецьмі. Таму асабліва важна, як будзе арганізаваны гэты невялікі адпачынак, з якімі ўражаннямі дзеці вернуцца ў школу.**

СТАР. 6



Фота Лізаветы ГОЛАД.

З першых вуснаў

# «ВЫ ВЕЛЬМІ ВАЖНАЕ, НАДЗЕЙНАЕ ЗВЯНО Ў СІСТЭМЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ»

**Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел ва ўрачыстым сходзе, прысвечаным 30-годдзю з дня ўтварэння Службы бяспекі Прэзідэнта**

**Звяртаючыся да ўдзельнікаў урачыстасці, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта вельмі рэдкі выпадак, калі большасць супрацоўнікаў Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь знаходзіцца ў Палацы Незалежнасці ў якасці гасцей, а не на баявым дзяжурстве. У гэты важны дзень яны атрымалі з рук кіраўніка дзяржавы заслужаныя ўзнагароды.**

### «Такое служэнне Радзіме не кожнаму па сілах»

Беларускі лідар нагадаў, што Служба бяспекі, як і многія дзяржаўныя структуры, была створана 30 гадоў таму. «Гэта быў найскладанейшы перыяд, ліхія дзевяностыя, — канкрэтызаваў ён. — А ў цяжкія часы, як вядома, патрэбны былі моцныя людзі, бо іншыя проста не справіліся б з тымі задачамі, якія тады стаялі перад краінай».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што пасля першых прэзідэнцкіх выбараў перад ім стала пытанне аб тым, як павінен выглядаць сілавы блок краіны і каму даверыць бяспеку вышэйшых службовых асоб Беларусі, спецыяльных аб'ектаў і высокіх замежных гасцей на тэрыторыі нашай краіны.

Невыпадкова ў першы склад Службы бяспекі Прэзідэнта адбіралі найлепшых з сілавых структур. «Патрэбны былі не проста прафесіяналы ў пагонах, а, па-першае, безумоўна адданыя сваёй краіне афіцэры, разумныя і адказныя патрыёты, якія выканаюць воінскі абавязак і не здрадзяць за 30 срэбранікаў, — паведаміў кіраўнік дзяржавы. — Прыйшлі найлепшыя з найлепшых. Гэтая практыка захоўваецца і дагэтуль».

Успамінаючы перыяд станаўлення Службы бяспекі, Прэзідэнт нагадаў, што тады і камандзірам, і радавым супрацоўнікам трэба было адразу ж уключацца ў работу і паралельна вучыцца. І вучыцца, па яго словах, трэба было шмат і шмат чаму.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што сёння Служба бяспекі Прэзідэнта забяспечана самымі сучаснымі зброяй, тэхнікай, сродкамі абароны, з'яўляецца адным з найбольш баяздольных і падрыхтаваных воінскіх фарміраванняў. Кіраўнік дзяржавы ўдакладніў, што хацеў бы, каб супрацоўнікі Службы бяспекі былі самымі баяздольнымі і падрыхтаванымі.

«Вы вельмі важнае, надзейнае звяно ў сістэме нацыянальнай бяспекі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Нездарма ваш дэвіз — «Служба без права на памылку». Сапраўды, права на памылку ў вас няма».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што поспехі Службы бяспекі часцей за ўсё так і застаюцца пад грыфам «сакрэтна». «Вы павінны быць эфектыўнымі і нябачнымі, — падкрэсліў ён. — Такое служэнне Радзіме не кожнаму па сілах. Не многія рызыкнуць выбраць такі прафесійны шлях, дзе трэба быць пастаянна гатовымі да дзеяння. Любы з вас у выпадку надзвычайных абставін закрые сабой не толькі асобу, якая ахоўваецца, але і мірных грамадзян, жанчын, старых, дзяцей, у рэшце рэшт сваю краіну. Гэта і ёсць найвышэйшая духоўна-маральная місія сапраўднага абаронцы».

### «Вы павінны быць рэзервам для любых галін»

Цяпер, калі ў свеце поўна гарачых канфліктаў, калі мяняецца архітэктура бяспекі, а рызыкі і пагрозы толькі ўзрастаюць, па меркаванні Прэзідэнта, добра відаць крызіс і ў рабоце спецслужбаў многіх дзяржаў. Ён нагадаў, што толькі за гэты год у Штатах неаднаразова рабілі замах на былога прэзідэнта і кандыдата ў прэзідэнты Дональда Трампа, а ў прэм'ер-міністра Славакіі Роберта Фіца ўсадзілі некалькі куль непасрэдна на мітынгу ў прысутнасці асабістай аховы.

«Таму самая вялікая каштоўнасць Службы бяспекі — воінскі калектыў, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Служба — гэта не проста прафесіяналы, як паказалі 30 гадоў, якія мы прайшлі разам. Вы павінны быць рэзервам для любых галін. Не толькі ваенных».

Па словах кіраўніка дзяржавы, супрацоўнікі Службы бяспекі працягваюць служыць краіне і народу ў розных арганізацыях нават пасля звальнення ў запас. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што яны выдатна зарэкамендавалі сябе на адказных дзяржаўных пасадах, у тым ліку высокіх. Так, па яго словах, будзе і далей.

«Ды і ў цэлым, мне здаецца, няма такой работы, з якой не справіўся б наш супрацоўнік — былы або дзеючы, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Праўду кажуць: былых не бывае. Я ўсім вам за гэта ўдзячны — як Прэзідэнт і як чалавек».

### «Дакладнасць, сістэмнасць, прадуманасць»

У гэты святочны дзень Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць за службу ўсім ветэранам і цяперашнім ваеннаслужачым Службы бяспекі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Службы бяспекі павінна быць дакладная арганізацыя, дысцыпліна і сістэма. «Калі ў чымсьці ў вас няма сістэмы, вы яе ствараце, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Вы яе стварылі, але сістэма павінна быць заўсёды. Каб было відаць, што гэта афіцэры самага элітнага падраздзялення ў нашай краіне. Дакладнасць, сістэмнасць, прадуманасць — галоўнае ў гэтай службе».

Беларускі лідар падкрэсліў, што супрацоўнікі Службы бяспекі Прэзідэнта з'яўляюцца самымі падрыхтаванымі байцамі, якія маюць выдатную фізічную падрыхтоўку і дасканала валодаюць зброяй. «Але перш чым ісці, бегчы, страляць, вы павінны думаць, — звяртаючыся да супрацоўнікаў падраздзялення, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вы павінны думаць і выбудоўваць дакладную сістэму. У гэтым адрозненне вас ад звычайных ваенных».

Начальнік Службы бяспекі Прэзідэнта Дзмітрый Шахраеў ад імя ўсяго асабовага складу, членаў сем'яў ваеннаслужачых выказаў удзячнасць кіраўніку дзяржавы за ўвагу і падтрымку, якая аказваецца падраздзяленню. Асаблівыя словы падзякі — за прынятыя рашэнні, якія дазваляюць Службе бяспекі на больш высокім, прафесійным і якасным узроўні выконваць свае абавязкі. Начальнік падраздзялення ўручыў кіраўніку дзяржавы юбілейны медаль «30 гадоў Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

### «Калі будзе складана, мы пойдзем наперадзе»

Напрыканцы ўрачыстага сходу кіраўнік дзяржавы заўважыў, што недарэмна сказаў аб тым, што былых супрацоўнікаў Службы бяспекі, спецпадраздзяленняў не бывае. «Вы да канца свайго жыцця, як і Прэзідэнт, павінны быць у страі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму тыя, хто завяршае або завершыць у будучыні сваю частку жыцця ў ваенных адносінах (вы гэта адчуваеце, напэўна), найлепшыя з найлепшых з вас будуць накіраваны на працоўны фронт — грамадзянскі, дзе вы будзеце выконваць сваю місію. Заўсёды да гэтага сябе рыхтуйце. А калі хтосьці вырашыць застацца ваенным, я буду гэта толькі вітаць».

Беларускі лідар засяродзіў увагу на тым, што час цяпер складаны. «Я ўсё раблю для таго, каб нам не прыйшлося браць у рукі зброю для таго, каб страляць (толькі ў вучэбных мэтах), — падкрэсліў ён. — Але калі будзе складана, вы павінны ведаць, што мы пойдзем наперадзе. Вы пойдзеце наперадзе, у тым ліку і Прэзідэнт. Такое наша жыццё. Але давайце будзем рабіць усё, каб гэтага не адбылося».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Любы палітык, які замахнецца на суверэнітэт Беларусі, будзе знесены яе народам»

**Аб чым яшчэ Прэзідэнт Беларусі гаварыў у інтэрв'ю выданню «Известия»**

**Як мы ўжо паведамлялі, Аляксандр Лукашэнка ў Казані на палях саміту БРІКС даў некалькі знакавых інтэрв'ю, у тым ліку выданню «Известия». Сёння мы публікуем яго новыя падрабязнасці з адказамі на актуальныя тэмы.**

### Аб магчымасці ўваходжання Беларусі ў склад Расіі

«Я заўсёды настойваў і настойваю на тым, што дом, — калі ўявіць Саюзную дзяржаву як дом — трэба будаваць з фундамента. Што з'яўляецца фундаментам нашых адносін? Эканоміка. Таму трэба выбудоўваць эканамічную аснову гэтай дзяржавы. І другое, маё жалезнае патрабаванне, умова: у нас агульная Айчына ад Брэста да Уладзівастока. Нікуды не дзенешся ад гэтага. Мы ўжо дзясяткамі гадоў, стагоддзямі да гэтага прывыклі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але так склалася, не па нашай віне, што тут дзве дзяржавы. Дзве суверэнныя дзяржавы: Беларусь і велізарная Расія. Гэта непахісны закон нашага часу».

«Таму ўсякія размовы аб тым, што імперыя там, сатэліт, не сатэліт, што ўнутр Расіі ўступіць і іншае... Станьце на маё месца. Вы што, з'яўляючыся Прэзідэнтам суверэннай (не гавару незалежнай — мы адзін ад аднаго залежым) дзяржавы, гэту дзяржаву заўтра знішчылі б? Я на гэта пайсці не магу, і мяне ніхто на гэта не ўпаўнаважыў. Гэта па-першае. Па-другое, любы рух любога палітыка ў гэтым кірунку — ён будзе знесены беларускім народам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Адначасова ён запэўніў, што беларусы для расіян — гэта самыя адданыя і надзейныя людзі. «Такіх адданых, адкрытых і сумленных у свеце больш няма для вас і не шукайце іх. Я вопытны палітык, і я ўжо гэта ведаю дакладна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Палітык, які не чапляецца за ўладу, — не тое што мне ўсё роўна, буду я на чале ўлады ці не буду, але які не чапляецца за ўладу. Я больш думаю аб дзецях цяпер, аб вашых і нашых, і гэтак далей — мы не павінны ў гэтым напрамку развіваць наша супрацоўніцтва».

### Аб мірных перагаворах па Украіне

Кіраўнік дзяржавы ў інтэрв'ю паўтарыў свой раней агучаны тэзіс аб тым, што сітуацыя вакол магчымых мірных перагавораў цяпер змянілася. Калі раней размова ішла аб тым, што мір ва Украіне магчымы пры згодзе ЗША і Еўропы — калектыўнага Захаду, то цяпер яны ўжо больш хочуць міру, чым сам Уладзімір Зяленскі. «Ён упёрся нечыста», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

З іншага боку, Захад не можа ўздзейнічаць на Зяленскага проста не даўшы чарговай порцыі грошай і зброі, бо гэта раўназначна страце твару. «Таму Захад гэтым шляхам не ідзе, але бачыць, што адбываецца на зямлі, дзе Расія ўпэўнена, паціху, крок за крокам, але рухаецца на фронце. У той жа Курскай вобласці рухаецца наперад. Яны ж гэта ўсё бачаць і ацэньваюць. І ацэньваюць па заслугах, не так, як Валодзя Зяленскі. Яны разумеюць, што можа настаць крах Украіны, а крах Украіны — гэта крах усяго калектыўнага Захаду, таму што яны ўвязаліся ў гэту вайну. І цяпер трэба неяк замірыцца. Але ўпёрся Валодзя Зяленскі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, цяпер такі момант, калі ідзе гэта ломка. «І зварушыўся ён (Зяленскі. — **«Зв.»**) крыху раней, і цяпер асабліва, са сваімі «планамі перамогі». Гэта заклікі фактычна да мірных перагавораў, а ў Расіі таксама ўжо змяніўся пункт гледжання. На зямлі Расія рухаецца наперад, на зямлі многае змянілася, на фронце», — падзяліўся разважаннямі кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу, што «курская авантура» ўкраінцаў сітуацыю сур'ёзна змяніла. «Расію таксама — сённяшняя сітуацыя змяніла, будзем разважаць інакш, у іншым месцы і па іншых пытаннях. Ну можа так сказаць? Пакуль яшчэ не зусім сказала, але можа сказаць. Але я задаволены, што расіяне і Уладзімір Пуцін займаюць такую канструктыўную пазіцыю. Украінцам трэба ўлічваць гэту пазіцыю, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Будзем спадзявацца, што да канца снежня Курская вобласць будзе вызвалена. І будуць нейкія зрухі ў плане перагавораў. Мы гатовы дзейнічаць у гэтым кірунку».

Гаворачы аб праведзеных нядаўна сваіх закрытых перагаворах з прадстаўнікамі Захаду, Прэзідэнт канстатаваў, што і там ужо ўсведамляюць: вайна — гэта віна двух бакоў. «Цяпер на перагаворах мне сказалі, што так, мы згодны. Тут трэба ўзяць віну на сябе двум бакам. І Украіне, а не толькі даймаць Расію. Гэта гаворыць Захад. Гэта пэўныя зрухі ўжо», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка не стаў агучваць, з прадстаўнікамі якіх менавіта краін ён вёў закрытыя перагаворы: «Таму што мы дамовіліся, што гэта перагаворы закрытага характару. Хоць некаторыя там, за мяжой, сёе-тое прасачылі і пачынаюць: «А, вось туды паляцеў самалёт, вунь там нехта паехаў», і гэтак далей. Але мы гэта не каментуем».

### Аб прызнанні новых расійскіх тэрыторый

У Прэзідэнта спыталі, ці стаіць на парадку дня ў Мінска і Масквы пытанне прызнання Крыма і новых рэгіёнаў расійскімі тэрыторыямі, а таксама ці мае намер беларускі лідар паехаць у Крым.

«У Крым? Думаю, што гэта пытанне ад журналіста больш. Ну, калі трэба паехаць, паеду. Я чалавек рашучы. Ну а якая неабходнасць сёння або ўчора была ехаць у Крым? Я сваю пазіцыю абазначыў у самым пачатку. Паўтараю проста тое, што я сказаў у самым пачатку крымскіх падзей: дэ-факта Крым расійскі, дэ-юрэ — не. Чаму? Таму што юрыдычна гэтыя пытанні аднабакова ўрэгуляваны. І міжнародная так званая супольнасць (што не хваліе Расію, і я так зрабіў бы) не прызнае Крым расійскім. Вось мая пазіцыя», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым ён звярнуў увагу, што Беларусь адразу пачала супрацоўнічаць з Крымам, робіць гэта і цяпер, гэтак жа, як і з іншымі рэгіёнамі. «Дарэчы, кіраўніцтва Украіны і ваенныя нас за гэта вельмі папракаюць, што гэтыя беларускія арганізацыі, якія супрацоўнічаюць з гэтымі, як яны гавораць, захопленымі абласцямі, трапяць пад санкцыі. Дык яны і так пад санкцыямі. Ужо далей няма куды трапляць. Ну а тое, што трэба Данбасу і Крыму, калі ў нас гэта ёсць, мы гэта прадаём. Яны ж за гэта плацяць. Чаму нам не супрацоўнічаць з імі?» — заўважыў Прэзідэнт.

«Ну і потым, я думаю, што Украіне, напэўна, не зусім правільна дыктаваць нам умовы, з кім супрацоўнічаць. Украіна першая, раней за Еўрасаюз, Амерыку, увяла супраць нас санкцыі. Якія да нас могуць быць патрабаванні? Таму гэта пытанне, напэўна, як мінімум адкладзенае. Калі я буду ехаць у Крым, я вас запрашу як журналіста. Абяцаю», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Міжнародны вектар

# «Наша задача — зрабіць усё для ўмацавання сяброўскіх адносін»

## Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з паслом Сербіі


Фота БелТА.

**У асобе Іліны Вукайлавіч спікер павіншавала сербскі народ з 80-годдзем вызвалення Бялграда ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і падкрэсліла, што ў Савеце Рэспублікі з радасцю ўспрынялі паведамленне аб тым, што, нягледзячы ні на што, у адрозненне ад многіх еўрапейскіх краін, якія сёння спрабуюць перапісаць гісторыю, Сербія адзначае падзеі, якія адбываліся шмат гадоў таму.**

### «Самае галоўнае дасягненне Беларусі і Сербіі — магчымасць жыць на сваёй зямлі»

«Наша гісторыя, нашы гістарычныя карані — вядома, гэта толькі сяброўскія адносіны паміж нашымі краінамі», — канстатавала Старшыня Савета Рэспублікі, падкрэсліўшы, што ў лістападзе будзе адзначацца 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі.

«Як сказаў наш Прэзідэнт, Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, выступаючы ў 2019 годзе ў Народнай скупшчыне (сербскі парламент. — **«Зв.»**), самае галоўнае дасягненне Беларусі і Сербіі — гэта магчымасць жыць на сваёй зямлі, — нагадала Наталля Качанава. — Гэта праўда. Суверэнітэт, незалежнасць нашых краін — тое, што важна для любога народа, для любой дзяржавы».

Па словах спікера, як трэба адносіцца да Сербіі, у 1999 годзе паказаў Аляксандр Лукашэнка, наведваючы тагачасную Югаславію ў трагічныя для гэтай краіны дні. «Мы ўмацоўвалі наша супрацоўніцтва і будзем умацоўваць», — запэўніла Старшыня Савета Рэспублікі. Пры гэтым спікер звярнула ўвагу, што ва ўмовах уводу санкцый калектыўным Захадам супраць трэціх дзяржаў гэта няпроста.

«Таму наша задача — зрабіць усё для ўмацавання нашых добрых сяброўскіх адносін, — канкрэтызавала Наталля Качанава. — Развівацца абсалютна па ўсіх кірунках: эканоміцы, гуманітарнай сферы. Для нас вельмі важнае міжпарламенцкае супрацоўніцтва. Мы пастараемся зрабіць усё для таго, каб сяброўскія адносіны паміж парламентарыямі нашых краін былі на карысць нашым народам, нашым краінам».

Кажучы аб эканамічным аспекце двухбаковага ўзаемадзеяння, спікер звярнула ўвагу на тое, што наперадзе — шмат работы. «Хацелася б, каб і тавараабарот быў больш важкім, — канкрэтызавала яна. — Думаю, мы зробім усё для таго, каб гэтая сітуацыя памянялася, бо мы з вамі цудоўна разумеем, што эканоміка — гэта вельмі важна».

Наталля Качанава адзначыла, што Беларусь і Сербію звязваюць добрыя цёплыя адносіны на працягу ўсёй гісторыі. «Гэта і культура, агульныя сувязі нават у плане рэлігійных адносін, — удакладніла спікер. — Літаральна ў гэтыя выхадныя ў Мінску будзе закладвацца храм у гонар Савы Сербскага».

Яшчэ адным важным аспектам узаемадзеяння, па словах Старшыні Савета Рэспублікі, бачыцца падтрымка адзін аднаго на міжнароднай арэне, у міжнародных арганізацыях. «Упэўнена, што тая падтрымка, якую мы аказвалі і будзем далей аказваць адзін аднаму, дасць свае вынікі», — падкрэсліла спікер.

Наталля Качанава прапанавала ўзмацніць работу па лініі жаночых і маладзёжных грамадскіх арганізацый. Узаемадзеянне яшчэ і па гэтых кірунках, па яе словах, стане залогам далейшага сяброўства і двухбаковага супрацоўніцтва. «Мы накіраваны працягваць тыя добрыя пачынанні, якія былі паміж нашымі краінамі, і, вядома, нам трэба зрабіць усё для таго, каб гэтае супрацоўніцтва было больш эфектыўным і плённым», — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

### «Парламентарыі могуць зрабіць істотны ўнёсак у падтрыманне міру на планеце»

Як адзначыла ў размове з журналістамі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Іліна ВУКАЙЛАВІЧ**, у дзвюх краін вельмі добрыя планы на будучыню. «У нас цэлы шэраг кірункаў, па якіх можна супрацоўнічаць, — канкрэтызавала яна. — Сербія з'яўляецца краінай, якая будзе арганізоўваць EXPO ў 2027 годзе. Гэта вельмі вялікі поспех для нас. Запрашаем усіх, у першую чаргу сяброўскую Беларусь, прыняць удзел, паказаць свае магчымасці і патэнцыял ва ўсіх сферах».

Па словах кіраўніка дыпламатычнай місіі, Сербія паказвае вельмі добрыя вынікі ў эканоміцы і гатова абмяняцца вопытам, падзяліцца сваімі поспехамі з Беларуссю.

Кажучы аб міжпарламенцкім узаемадзеянні, дыпламат адзначыла, што існуе шмат кірункаў, па якіх можна рухацца. «Лічым, што народная дыпламатыя з'яўляецца вельмі важнай, — падкрэсліла яна. — Сёлета пачаў работу новы склад нашага парламента, заснавана група сяброўства з Беларуссю, куды ўваходзіць 35 нашых дэпутатаў. Яны вельмі рады супрацоўнічаць на ўсіх магчымых узроўнях. У цэлым плануем працягнуць супрацоўніцтва з Беларуссю абсалютна па ўсіх кірунках на карысць нашых народаў».

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Рэспублікі Сербія Дзмітрый ЖУК** звярнуў увагу на тое, што ў сучасным свеце парламенцкая дыпламатыя набывае новую вагу. «У перыяд міжнароднай турбулентнасці, калі мяняецца светаўладкаванне, важны кожны канал камунікацыі паміж дзяржавамі, — перакананы сенатар. — Парламентарыі як элемент і народнай дыпламатыі могуць зрабіць вельмі істотны ўнёсак у падтрыманне міру на нашай планеце. Таму на гэтыя групы, якія існуюць і ў нашым парламенце, у Народнай скупшчыне Сербіі, ускладаецца пэўная надзея, што прамы дыялог дапаможа нам развіваць адносіны менавіта ў сферы ўзаемаразумення».

**Вераніка КАНЮТА.**

Спецыяльны рэпартаж

# На маршруце «Марафону адзінства» — Жлобін




**Эмацыянальна насычаную і пазнавальную праграму для ўдзельнікаў грамадска-культурнай акцыі падрыхтавала сталіца металургаў. Першы дзень яе правядзення на Жлобіншчыне парадаваў цікавымі сустрэчамі, знаёмствамі з прадпрыемствамі — брэндамі раёна і яго выдатнымі жыхарамі.**

— Усе працоўныя калектывы падключыліся, кожны калектыў унёс свой уклад у падрыхтоўку да мерапрыемства, — на пачатку маштабнай святочнай праграмы, якая разгортвалася ў Жлобіне, удзельнікаў акцыі прывітаў **старшыня Жлобінскага райвыканкама Сяргей ЯРАЦ**. Кіраўнік раёна падкрэсліў, што для Жлобіншчыны стаць адным з цэнтраў па маршруце «Марафону адзінства» — вялікі гонар і адказнасць.

Жлобін як адзін з раёнаў, моцных сваім індустрыяльным патэнцыялам, запрасіў удзельнікаў акцыі пазнаёміцца са сталіцай металургаў праз наведванне прадпрыемстваў-флагманаў.

— Два дні марафону будуць вельмі насычанымі. Ставім для сябе задачу пазнаёміць гасцей з нашым краем, стварыць святочную атмасферу для нашых жыхароў, — зазначыў Сяргей Ярац. — Мы лічым, што адзінства нашай краіны — гэта ў тым ліку моцныя кааперацыйныя ўзаемаадносіны паміж прадпрыемствамі.

Кіраўнік райадміністрацыі звярнуў увагу на тое, што «Марафон адзінства» дае магчымасць кожнаму гораду на яго маршруце перадаць сваю непаўторнасць. І дадаў, што падчас акцыі Жлобінскі лядовы палац ператворыцца ва ўнікальную канцэртную пляцоўку.

— Больш як 2,5 тысячы гледачоў змогуць убачыць нумары артыстаў з Мінска, з іншых абласцей і таксама паказаць сябе. Мерапрыемства стане яскравым прыкладам, што мы адна краіна, мы адна сям'я і будучыня ў нашых руках, — падкрэсліў старшыня райвыканкама.

прасторы. Завод стабільна развіваецца і ўкараняе новыя тэхналогіі. Як адзначылі блогеры, унікальны шанц наведаць прамысловы гігант дазволіць ім падзяліцца ўбачаным з падпісчыкамі, жыхарамі самых розных рэгіёнаў.

Асаблівае месца на карце Жлобіншчыны і назаўжды ў сэрцах жыхароў усёй краіны — мемарыяльны комплекс «Дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны». Кантэнт-мейкеры і творчыя калектывы аддалі даніну памяці ахвярам




Удзельнікам «Марафону адзінства», блогерам і прадстаўнікам творчых калектываў прадставілася ўнікальная магчымасць на свае вочы ўбачыць, што такое металавытворчасць, пабываць у цэхах Беларускага металургічнага завода. Падчас экскурсіі па прадпрыемстве яны даведаліся, што сёння Жлобінскі БМЗ — адзінае прадпрыемства такога маштабу на постсавецкай

вайны ў Красным Беразе. Гэты мемарыяльны комплекс — адзіны ў сваім родзе на тэрыторыі СНД. У гады нямецкай акупацыі менавіта тут гітлераўцы стварылі зборны пункт для гвалтоўнай адпраўкі дзяцей у Германію.

У Красным Беразе ўдзельнікі акцыі наведалі таксама сядзібны комплекс Козел-Паклеўскіх XIX стагоддзя, размешчаны непадалёк ад мемарыяла. Амаль дзесяць гадоў таму скончылася яго маштабная рэстаўрацыя. Сёння палацава-паркавы ансамбль Козел-Паклеўскіх займае сваё пачэснае месца ў культурна-гістарычнай спадчыне Беларусі. Ён па праве лічыцца жамчужынай Жлобіншчыны і з'яўляецца вядомым цэнтрам прыцягнення турыстаў на Гомельшчыне.

Па традыцыі ўдзельнікаў «Марафону» чакалі на «Нясумнай Нялекцыі». Сустрэчу, якую прысвяцілі тэме выбару і яго значэнню ў жыцці і лёсе чалавека, арганізавалі на базе Жлобінскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання. Спікерамі на ёй выступілі **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ** і **кіраўнік праекта «Млын моды», загадчык аддзела моды і дызайну Нацыянальнага мастацкага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Ігар ІВАНОЎ.**

Як адзначыла Кацярына Пятруцкая, у рамках «Марафону адзінства» «Нясумныя Нялекцыі» ўжо прайшлі ў Маладзечне і Гомелі.

— Водгукі вельмі добрыя. Мы правялі апытанне: ці параілі б юнакі і дзяўчаты ўдзел у такім мерапрыемстве сваім сябрам, і 99,9 % апытаных адзначылі, што параілі б, — зазначыла намеснік міністра.

Ігар Іваноў падчас сустрэчы звярнуў асаблівую ўвагу на важнасць выбару будучай прафесіі для падлеткаў, значнасць і прэстыж рабочых спецыяльнасцяў. Ён нагадаў, што рэспубліканскі фестываль-конкурс моды і фота «Млын моды» таксама робіць свой уклад у папулярызацыю прафесіі швачак, канструктараў, мадэльераў.

Пракаціцца ў зале на новенькім веласіпедзе... Толькі так, калі ты адзін з лідараў абласнога этапу творчых спаборніцтваў у рамках «Марафону адзінства». Падчас грамадска-культурнай акцыі на Жлобіншчыне прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў абласнога этапу конкурсу малюнкаў навучэнцаў пачатковых класаў «Мы разам» і рэспубліканскага конкурсу сачыненняў на тэму «Што такое адзінства».

***Больш падрабязна чытайце ў найбліжэйшым нумары «Звязды» і на сайце zviazda.by***

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота ТК «Гомельшчына афіцыйна».**

# ЭЛЕКТРАЗАБЕСПЯЧЭННЕ, ПАДЗЕЛ ЗЯМЛІ І БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ

## Якія пытанні хвалююць жыхароў Барысаўшчыны?

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН правёў асабісты прыём грамадзян у Барысаве. І хоць раён лічыцца адным з самых паспяховых, праблем тут усё ж хапае. На прыём да кіраўніка вобласці запісалася больш за 20 чалавек. Карэспандэнт «Звязды» разам з адказнымі асобамі пастараўся разабрацца, ці магчыма рэканструяваць сістэму электразабеспячэння, чаму бізнесменам адмаўляюць ва ўводзе будынка ў эксплуатацыю і з-за чаго пенсіянерка не можа падзяліць свой зямельны ўчастак.**

### ПЕРАБОІ Ў ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

Першай на прыём прыйшла жыхарка аграгарадка Старабарысаў Вольга Сяргееўна. Жанчына ўзняла пытанне аб рэканструкцыі сістэмы электразабеспячэння. Праблемы вострыя і жыццёвыя. Жанчына жыве на вуліцы Перамогі. І ў доме адбываюцца частыя перабоі ў электрычнасці. Напружанне зніжаецца да 120 вольт. З-за гэтага не працуюць бытавыя прыборы.

«Мы не можам дамовіцца з барысаўскімі электрасеткамі, каб яны стварылі ўмовы, пры якіх не будзе перападаў электранапружання. Мы не можам карыстацца асвятленнем у вячэрні час. Тыя, хто атрымаў (тры дамы ў нас) дазвол на ўстаноўку электраплітаў, не могуць карыстацца імі, таму што напружання няма. Таксама не працуюць пральныя машыны і іншыя электрапрыборы. У людзей гарыць тэхніка, і з гэтым пытаннем у нас не атрымліваецца дамовіцца».

Таксама існуюць праблемы з ацяпленнем. Па словах заяўніцы, газ у пасёлку маецца, але на вуліцу Перамогі правесці яго тэхнічна немагчыма. Дадзеная вуліца адрэзана ад асноўнага пасёлка тэхнічным вадаёмам. «Правядзенне газу праз суседні пасёлак будзе перасякаць дарогу рэспубліканскага значэння. Ніводзін праекціроўшчык не падпіша нам дазвол», — распавяла жанчына.

Па словах генеральнага дырэктара «Мінскэнерга» Паўла Гарудкі, праблема сапраўды існуе: «Сеткі старыя, 1971 года. Мы падтрымліваем іх у нармальным стане, але прапускная здольнасць сетак усяго 3 кВт. Што датычыцца перападаў напружання, мы рабілі замеры: у дзённы час паказчыкі былі нармальныя. Яшчэ павесім прыбор і паглядзім, як ідзе справа ў вячэрні час. Але ёсць нядобрасумленныя спажыўцы, таму і напружанне скача. Прымем меры: можа, дзесьці ўзмоцнім лінію».

Старшыня Мінскага аблвыканкама даручыў узяць пытанне на кантроль. «Гэтая гісторыя ўжо не першы год доўжыцца. Вы кажаце, што ёсць нядобрасумленныя спажыўцы: але ж людзі штомесяц плацяць за спажыванне электрычнасці. І калі жыхарам выдадзена 3 кВт, можна паглядзець: чалавек аплачвае 100 кВт за месяц ці 300 кВт. Як хочаце, але каб усё было ў парадку і людзі больш не пакутавалі ад перападаў напружання», — даў даручэнне кіраўнік Міншчыны.

### МАЙСТЭРНЯ АБО КАФЭ?

З пытаннем увядзення будынка ў эксплуатацыю прыйшла на прыём індывідуальны прадпрымальнік Наталля Аляксееўна. З 2012 года жанчына здавала ў арэнду будынак майстэрні, які перайшоў ёй па спадчыне. У 2015 годзе будынак узяла юрыдычная асоба, дзе адным з заснавальнікаў быў сын заяўніцы. З 2017 года па сямейных абставінах сын Наталлі Аляксееўны перастаў займацца будынкам, даверыў яго другому заснавальніку.

«Пасля гэтага справы пайшлі дрэнна, з'явілася шмат даўжнікоў. І ў 2018 годзе будынак ужо быў у стратах, утварылася вялікая запазычанасць, — распавяла барысаўчанка. — І ўсё ж такі будынак працаваў да 2019 года, выкарыстоўваўся як кафэ. Але потым там выявілі самавольную рэканструкцыю, за што быў выпісаны штраф. Плюс там знайшлі шмат іншых парушэнняў. Мы ўсё выправілі, знеслі частку самавольнай прыбудовы. Потым аказалася, што не хапае выхадаў эвакуацыі, няма пажарнай сігналізацыі. У 2019 годзе будынак давялося закрыць да прывядзення ўсіх дакументаў у парадак, выпраўлення ўсіх парушэнняў».

Да канца мінулага года ўсе парушэнні былі ліквідаваны, аднак увесці ў эксплуатацыю будынак дагэтуль не атрымліваецца. Адзначаюць, што ён не адпавядае крытэрыям кафэ і яго нельга ўзаконіць. «Але мы хочам адкрыць там майстэрню, а не кавярню. Нам жа проста выпісалі пратакол, што мы выкарыстоўваем аб'ект не па прызначэнні. Хаця будынак не выкарыстоўваецца ўжо пяць гадоў», — адзначыў Антон Мікалаевіч, які выступае па даверанасці заяўніцы.

«На якой падставе вы адмаўляеце ва ўводзе аб'екта ў эксплуатацыю менавіта як майстэрні і ацэньваеце як кафэ? — абурыўся старшыня Мінаблвыканкама. — Тым больш, калі яно адпавядае крытэрыям майстэрні?» Аляксандр Турчын дадаў, што самавольна пабудаваны аб'ект можна ўвесці ў эксплуатацыю па мэтавым прызначэнні.

«Гэта значыць — ніякага кафэ там не будзе! — падкрэсліў кіраўнік Міншчыны. — Калі майстэрня, то займаецеся рамонтам абутку, адзення. Пытанне пераводу аб'екта ў будынак грамадскага харчавання патрабуе праектна-каштарыснай дакументацыі. Каб вырашыць пытанне з уводам у эксплуатацыю майстэрні, заяўнікі павінны напісаць заяву ў райвыканкам, прыкласці ўсе неабходныя дакументы».

### ЯК ВЫКУПІЦЬ ГАРАЖ НА МЕСЦЫ ЗВАЛКІ?

Леанід Паўлавіч і Кацярына Леанідаўна з вёскі Малое Стахава Барысаўскага раёна на прыём да кіраўніка Міншчыны прыйшлі з пытаннем узаконьвання і выкупу зямельнага ўчастка. Побач з іх домам доўгі час была звалка. Вяскоўцы прыбралі смецце і паставілі металічны гараж, зрабілі дашчаны навес. Аднак сельвыканкам не дазваляе ўзаконіць і выкупіць гэтую зямлю.

«Зразумела, навес выглядае не зусім прэзентабельна. Але, калі нам дадуць магчымасць выкупіць зямлю, усё прывядзём у парадак. Але нам і ў гэтым адмовілі», — зазначыла Кацярына Леанідаўна.

Дадзеную праблему пракаментаваў начальнік галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання Мінскага аблвыканкама Сяргей Шымук: «Гэта не капітальны будынак, а металічны гараж. Такі аб'ект мы не маем права ўзаконіць. А што датычыцца зямлі, гэта праезд да іншых участкаў. У заяўнікаў няма магчымасці яго выкупіць».

Аляксандр Турчын паглыбіўся ў праблему. «Навес трэба прыбраць канчаткова. Гараж таксама прыйдзецца перанесці, тады мы зможам вылучыць вам участак. Пасля паставіце там больш фундаментальны гараж», — падагульніў губернатар.

### ЯК ПАДЗЯЛІЦЬ ЗЯМЕЛЬНЫ ЎЧАСТАК?

Пенсіянерка Яўгенія Рыгораўна валодае 2/5 долі ўчастка ў вёсцы Пчэльнік Барысаўскага раёна. 3/5 долі гэтага ўчастка належыць яе пляменніку. Уладальнікі зямельнага ўчастка вырашылі яго падзяліць, але не чакалі, што за гэтую паслугу ім выставяць велізарны кошт.

«Нашу вёску аднеслі да аграгарадка Старабарысаў, таму за падзел зямельнага ўчастка мы павінны заплаціць каля 20 тысяч долараў. Але дзе ўзяць такія грошы?» — пытае заяўніца.

Каб падзяліць зямельны ўчастак і атрымаць зямлю ў прыватную ўласнасць, заяўніцы і яе пляменніку прыйдзецца заплаціць рынкавы кошт зямлі. «Гэта каля 1000 долараў за сотку. Значыць, усяго 20 тысяч долараў, каб райвыканкам разгледзеў пытанне падзелу зямельнага ўчастка», — патлумачыў начальнік галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання Мінскага аблвыканкама Сяргей Шымук.

На пытанне губернатара, навошта наогул дзяліць гэтую зямлю, заяўніца адказала: «Каб нам на другім участку пабудаваць яшчэ адзін дом. А пляменнік хоча далучыць да сваёй зямлі і выкарыстоўваць пад агарод».

«Трэба разабрацца, а ці будзе магчымасць пасля падзелу ўчастка пабудаваць дом на пяці сотках, — сказаў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна. — А ваш пляменнік павінен разумець: калі ён падзеліць участак, то будзе абавязаны там пабудаваць дом, а не займацца агародам». Губернатар даручыў мясцовым службам сустрэцца з пляменнікам Яўгеніі Рыгораўны, каб яшчэ раз удакладніць усе дэталі па пытанні.

### СТАЦЬ НА ЎЛІК І ПАБУДАВАЦЦА

Жыхары Барысава Надзея Валянцінаўна і Андрэй Валянцінавіч выказалі жаданне стаць на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пражываюць у аднапакаёвай кватэры, дзе няма гарачай вады. Самі ладзілі сістэму ацяплення. Дом стары. Лічаць, што варта паляпшаць жыллёвыя ўмовы. Барысаўскі райвыканкам адмовіў у пастаноўцы на ўлік, бо ў барысаўчан ёсць адзін лішні квадратны метр жылля.

«Раней у доме было пячное ацяпленне. Потым печы дэмантавалі, правялі нам ацяпленне, газ — і на гэтым усё. Астатняе рабілі ўжо за свой кошт, — сказала Надзея Валянцінаўна. — Вада ў нас толькі халодная, а плацім за кватэру столькі ж, колькі мая мама, у якой трохпакаёўка. У нас жа менш чым 32 квадраты».

Яшчэ адна праблема — сырасць і цвіль у пакоях. «Падлога ў пакоях крывая, паўсюль адны ямы. Можа, кагосьці гэта задавальняе, але мы хочам добрае жыллё. Гатовыя пабудаваць кватэру за свой кошт па дзяржаўнай цане, толькі такой магчымасці не даюць», — заўважыў Андрэй Валянцінавіч.

Па словах заяўніцы, сям'я ніколі не будавала кватэру. «Чаму ж цяпер у ёй адмаўляюць? Я інвалід трэцяй групы, хутка і другую могуць даць». Надзея Валянцінаўна падкрэсліла, што ў мікрараёне Лядзішча актыўна ўзводзяць новабудоўлі — яны з мужам спадзяюцца пабудаваць там аднапакаёвую кватэру.

«Вы павінны разумець: калі і паставім вас на ўлік маючых патрэбу, чарга на жыллё падыдзе вельмі не хутка. Перад вамі 13 тысяч чалавек. Другое: лішнюю плошчу аднімуць з ільготнага крэдытавання. Гэта значыць, кошт за метр будзе фактычна раўняцца камерцыйнаму, — заўважыў старшыня Мінскага аблвыканкама. — Атрымліваецца, за гэтую кватэру вам давядзецца аддаваць сваімі грашыма: калі хочаце, напрыклад, жыллё ў 40 квадратных метраў, то гэта будзе 90 тысяч рублёў. За такую суму можна купіць яго на другасным рынку».

Намеснік начальніка — начальнік аддзела па жыллёвых пытаннях упраўлення ЖКГ, энергетыкі і паліва Мінскага аблвыканкама Анастасія Сабірай удакладніла: па законе паставіць мужа і жонку на чаргу тых, хто мае патрэбу, падстаў няма. Аднак яны могуць прэтэндаваць на арэнднае жыллё.

Аляксандр Турчын даручыў мясцовым уладам прааналізаваць стан дома заяўнікаў. «Потым прымем рашэнне па рамонце будынка», — падагульніў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

***г. Барысаў.***


## ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**государственного предприятия «Управление капитального строительства Запад» по жилому дому № 3 в составе объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями торгово-административного назначения и подземными гараж-стоянками в границах пр. Дзержинского, ул. Щорса (№ 3, № 4 по генплану)», *опубликованной в газете «Звязда» 14.10.2023***

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

**Офис продаж:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел. (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

**Режим работы офиса продаж:** понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договора создания объекта долевого строительства предлагаются:

| № п/п | Назначение помещения | Общая площадь, кв. м | Секция жилого дома | Этаж | Стоимость 1 кв. м общей площади, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Творческая мастерская | 62,40 | 3 | подвал | 4 500,00 |
| 2 | Творческая мастерская | 43,10 | 3 | подвал | 4 500,00 |
| 3 | Пункт проката спортивного инвентаря | 66,50 | 4 | подвал | 4 500,00 |
| 4 | Пункт приема прачечной | 29,90 | 4 | подвал | 4 400,00 |
| 5 | Пункт приема одежды в химчистку | 25,20 | 4 | подвал | 4 300,00 |

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере 30 % от стоимости договора в течение 10 (десяти) календарных дней с даты регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе, оставшаяся сумма – по графику платежей.

**Документы для заключения договоров** создания объектов долевого строительства **будут приниматься** и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди **с 8.30 04.11.2024 года** по адресу: **г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).**

**Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:**

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «Управление капитального строительства Запад» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: **220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213, тел.: +375 (17) 2341698, +375 (44) 7954444, +375 (44) 5593391.**

# Надзейны фундамент

## Падтрымка на дзяржаўным узроўні

Немалаважнай з'яўляецца і падтрымка сем'яў з боку дзяржавы.

— З часу набыцця суверэнітэту дзяржава бесперапынна інвестуе ў сям'ю, ствараючы маштабныя сацыяльныя праграмы, развіваючы ўмовы для нараджэння і выхавання дзяцей. Сацыяльная абарона і падтрымка сям'і дапамагае палепшыць якасць яе жыцця і забяспечыць выкананне сацыяльна-дэмаграфічных функцый, — падкрэсліла Алена Комлік.

Яна звярнула ўвагу, што задача сацыяльнай абароны — менавіта дапамагчы, а не поўнасцю забяспечыць жыццё сям'і.

Цяпер падтрымка сям'і дзяржавай беспрэцэдэнтная і пачынаецца яшчэ да нараджэння дзіцяці. Аснова закладзена ў працоўным заканадаўстве.

Так, жанчына, даведаўшыся пра сваё «цікавае» становішча, можа разлічваць на больш лёгкія ўмовы працы: будучых мам забаронена прыцягваць да звышурочных работ, работы ў дзяржаўныя святы і святочныя дні, работы ў начны час, выхадныя дні, накіроўваць у службовую камандзіроўку.

Сярод бонусаў таксама — сацыяльныя водпускі, бясплатнае медыцынскае суправаджэнне, матэрыяльная падтрымка ў выглядзе 11 дзяржаўных дапамог.

У прыватнасці, выплата дапамог пачынаецца яшчэ да нараджэння дзіцяці — гэта клопат аб здароўі маці і будучага малога з выдзяленнем ёй водпуску з поўным захаваннем заработнай платы.

Калі будучая маці своечасова стала на ўлік у жаночай кансультацыі і выконвае рэкамендацыі ўрача, ёй выплачваецца спецыяльная дапамога.

З нараджэннем дзіцяці дзяржава бярэ на сябе адказнасць па ўладкаванні малога дома, аказваючы істотную матэрыяльную падтрымку. Пры нараджэнні першага дзіцяці выплачваецца 4330 рублёў, а калі ў сям'і нарадзіўся не першынец — 6062 рублі.

— Да дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў усе ўжо прывыклі, і гэта мера ўспрымаецца як сама сабой зразумелая, але водпуск такой працягласці могуць дазволіць сабе далёка не ўсе краіны, як правіла, ён не перавышае год-паўтара. У Беларусі дапамога ў поўным памеры захоўваецца і пры афармленні малога ў дзіцячы садок, і пры выхадзе мамы на работу на няпоўны працоўны час (або таты — калі дзіця даглядае ён). Дапамога па доглядзе дзіцяці, памер якой складае 35—40 працэнтаў сярэдняй заработнай платы ў залежнасці ад чарговасці нараджэння дзяцей, выплачваецца незалежна ад занятасці і даходаў бацькоў, догляд дзіцяці залічваецца ў стаж для вылічэння працоўнай пенсіі. Акрамя таго, прадугледжана прадаўжэнне тэрміну кантракта як для маці, так і для бацькі, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці і пачалі работу не менш як да дасягнення дзіцем узросту 5 гадоў, — пералічвае прадстаўнік Мінпрацы.

Памер дапамогі па доглядзе першага дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў складае 778 рублёў, другога і наступнага — 889 рублёў, дзіця-інваліда — 1 тысяча.

Сёння ў краіне дапамогі выплачваюцца на 366 тысяч дзяцей, або на кожнае пятае дзіця ў краіне. Толькі ў бягучым годзе на гэта накіравана 3,4 мільярда, з іх 1,8 мільярда — на выплату дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў.

## Важныя льготы

Сёння дзяржпадтрымка арыентавана ў першую чаргу на шматдзетныя сем'і.

Найперш, гэта дапамога пры паляпшэнні жыллёвых умоў. Льготны крэдыт на жыллё даецца шматдзетнай сям'і пад 1 % гадавых на 40 гадоў.

Пры гэтым для сем'яў з трыма дзецьмі дзяржава пагашае 75 % ад сумы запазычанасці, для сем'яў з чатырма і больш дзецьмі сума запазычанасці цалкам пагашаецца дзяржавай. Гэта значыць, шматдзетныя сем'і, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, фактычна забяспечваюцца жыллём за кошт дзяржаўных сродкаў.

Летась 9,6 тысячы шматдзетных сем'яў палепшылі жыллёвыя ўмовы. Супермерай па праве называюць сямейны капітал, праграма працуе з 2015 года. Менавіта гэта мера дазволіла практычна ўдвая павялічыць колькасць шматдзетных сем'яў. Больш за 141 тысячу такіх сем'яў адкрылі ўклады «Сямейны капітал». З 2020 года пачаўся этап датэрміновага выкарыстання гэтых сродкаў.

Сёння прынята больш як 86 тысяч заяў аб датэрміновым распараджэнні, у асноўным на паляпшэнне жыллёвых умоў. Плануецца, што праграма будзе развівацца і далей.

— Шматдзетныя бацькі таксама атрымліваюць дадатковыя прэферэнцыі ў сферы падаткаабкладання, пенсіённага забеспячэння, адукацыі, працоўнага заканадаўства — усё для таго, каб вярнуць традыцыі шматдзетнасці ў грамадства, павысіць каштоўнасць сям'і з некалькімі дзецьмі. І мы паступальна рухаемся да гэтай мэты, — дадала Алена Комлік.

Большасць гарантый і льгот у сферы працоўнага і падатковага заканадаўства, прадугледжаных для маці ў сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей, распаўсюджваецца і на тат. З 1990-х гадоў бацькам дадзена права знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. Як і ў маці, у іх ёсць права выбару працоўнага водпуску ў летні час пры выхаванні ў сям'і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. У 2020 годзе для бацькоў з'явіўся кароткачасовы водпуск пры нараджэнні дзіцяці (на 14 дзён да спаўнення дзіцяці шасці месяцаў). Гэты водпуск наймальнік абавязаны даць, а па жаданні можа і аплаціць. У 2022 годзе ўказам Кіраўніка дзяржавы ўстаноўлена новае свята — Дзень бацькі.

## Каханне, вернасць, узаемадапамога

Толькі ў паўнацэннай сям'і магчымае гарманічнае развіццё чалавека, выказаў меркаванне **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы (Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхата) па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі, настаяцель прыхода ў гонар Усіх Святых протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ.**

— Сям'я — гэта цаглінка, а з такіх цаглінак складаецца грамадства. У такім разуменні яна — першая неабходнасць народа, які думае пра будучыню, а мы думаем пра будучыню. Сям'я ў пашыраным разуменні — шматдзетная ў шматлікіх пакаленнях, і яна прадстаўляе фамільны род, сыходзіць каранямі ўглыб. Ведаю, што сям'ю ў ідэале ствараюць адну на цэлае жыццё, пяты, шосты шлюб — гэта, даруйце, блюзнерства. У шлюбе муж і жонка абое выхоўваюць дзяцей і клапоцяцца аб састарэлых бацьках. Сям'я — гэта крэпасць. На чым будуецца сям'я? На грошах і выгадзе? Не. На дапамозе дзяржавы? Так, у нейкай меры, а калі крызіс? Каханне, вернасць, узаемадапамога, адказнасць за жыццё блізкіх — на спрадвечных каштоўнасцях будуецца сям'я. Але гэта не сямейныя каштоўнасці, а агульначалавечыя. А цярпенне, нясенне нягод адно аднаго, дараванне, ахвярнасць — тыя духоўныя каштоўнасці, без якіх не будзе сям'і. Працавітасць кожнага члена сям'і і сацыяльныя гарантыі — толькі ўмовы, інструмент дабрабыту сям'і, але не фундамент для крэпасці, — сказаў Фёдар Поўны.

## Прыярытэтны кірунак — здароўе маці і дзіцяці

**Іна САЛДАЦЕНКА, намеснік дырэктара па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава**, адзначыла, што брэндам айчыннай аховы здароўя з'яўляецца ўмацаванне здароўя маці, мацярынства і дзяцінства. Беларусь заявіла аб сабе як лідар у гэтым кірунку на сусветным рынку медыцынскіх паслуг, і паказчыкі, якія сістэма аховы здароўя дэманструе ў пытаннях родадапамогі, суправаджэння цяжарнасці, дапамогі жанчыне, гэта пацвярджаюць.

**Ірына КРАСЦЯЛЁВА, галоўны пазаштатны неанатолаг, загадчык лабараторыі клінічнай неанаталогіі і рэабілітацыі нованароджаных і дзяцей першага года жыцця РНПЦ «Маці і дзіця»**, звярнула ўвагу на сямейна арыентаваны падыход у ахове здароўя.

— Ахова мацярынства і дзяцінства ў нашай краіне з'яўляецца прыярытэтным кірункам. Дзяржава стварае спрыяльныя магчымасці для нараджэння, выхоўвання дзяцей, іх паўнацэннага развіцця. Ахова здароўя маці і дзіцяці — сістэма дзяржаўных мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне сям'і і падтрымку мацярынства, а таксама стварэнне ўмоў для здароўя і захавання сям'і, — падкрэсліла Ірына Міхайлаўна, дадаўшы, што асноўныя кірункі ў гэтым — прафілактыка, удасканальванне медыцынскай дапамогі асобам рэпрадуктыўнага ўзросту і мерапрыемствы па планаванні сям'і і ахове мужчынскага здароўя.

Спецыяліст нагадала, што ў краіне існуе магчымасць бясплатнай спробы ЭКА для бясплодных сем'яў. Яе эфектыўнасць — больш за 30 %, шляхам гэтай працэдуры нарадзілася звыш тысячы дзяцей.

— Абследуючы сямейную пару, часта бачым: праблема не ў жанчыне. Таму варта пачынаць абследаваць і мужчын. У РНПЦ «Маці і дзіця» такая работа праводзіцца, працуе цэлая каманда, — заўважыла Ірына Красцялёва.

РНПЦ аказвае высокатэхналагічныя віды медыцынскай дапамогі, у прыватнасці, тут выходжваюць глыбока неданошаных дзяцей: рэанімацыя разлічана на 30 ложкаў, такіх жанчын з немаўлятамі забіраюць з усіх рэгіёнаў.

Акрамя таго, сучасныя віды высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі ўключаюць дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі, якія дазваляюць бясплодным парам стаць бацькамі, выходжванне праблемных цяжарнасцяў, фетальную хірургію, уключаючы фетаскапічную карэкцыю антэнатальнай паталогіі плода. Апошняя прымяняецца для жанчын, якія маюць адмоўны рэзус-фактар, і плод можа не дажыць да нараджэння.

Магчымае і прымяненне штучнага інтэлекту для прагнозу неспрыяльных псіханеўралагічных адхіленняў у дзяцей, якія нарадзіліся з масай цела менш за 1,5 кг, выкарыстанне клетачнай тэрапіі для карэкцыі псіханеўралагічнага развіцця.

Нядаўна ўпершыню была ўнутрыўлонна праведзена аперацыя па карэкцыі спіннамазгавой грыжы ў плода. І нягледзячы на тое, што дзіця нарадзілася неданошаным, усе функцыі ўдалося захаваць. У глыбока неданошаных дзяцей праводзіцца карэкцыя постгеморагічнай гідрацэфаліі, карэкцыя слепаты.

Шэраг мерапрыемстваў па ранім умяшанні накіраваны на выяўленне дзяцей да трох гадоў з парушэннямі развіцця і рызыкай праяўлення такіх парушэнняў. У краіне адкрыта 42 цэнтры ранняга ўмяшання. Дапамогу тут аказваюць мультыдысцыплінарныя брыгады спецыялістаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Даніэл Шапу перамог на прэзідэнцкіх выбарах у Мазамбіку



Кандыдат ад кіруючай партыі «Фрэліма» 47-гадовы Даніэл Шапу перамог на прэзідэнцкіх выбарах у Мазамбіку. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на агенцтва AFP і даныя нацыянальнай выбарчай камісіі. Паводле афіцыйных звестак, Шапу набраў звыш 70 працэнтаў галасоў на выбарах, якія адбыліся 9 кастрычніка. Незалежны кандыдат Венансіу Мандланэ атрымаў каля 20 працэнтаў галасоў. На парламенцкіх выбарах, якія адбыліся адначасова з прэзідэнцкімі, партыя «Фрэліма» заваявала 195 з 250 месцаў у вышэйшым заканадаўчым органе — на 10 больш, чым мінулым разам. Такім чынам, яна атрымала канстытуцыйную большасць. Асноўная апазіцыйная партыя «Рэнама» здавольвалася 20 месцамі ў параўнанні з ранейшымі 60.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Даніэла Шапу з выбраннем на пасаду Прэзідэнта Мазамбіка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы пацвердзіў зацікаўленасць Беларусі ва ўмацаванні доўгатэрміновых сувязяў з Мазамбікам.**

## Шкода для эканомікі Лівана ад нападаў Ізраіля можа перавысіць $20 млрд



Эксперты адзначаюць, што ў выніку нападаў Ізраіля запавольваецца эканамічная дзейнасць у большасці сектараў эканомікі на поўдні Лівана і ў даліне Бека, у якіх пражывае траціна насельніцтва і працоўнай сілы дзяржавы. Аб гэтым напісала газета L'Orient-Le Jour са спасылкай на справаздачу групы ліванскіх экспертаў і эканамістаў Independent Task Force for Lebanon. Былі разбураны і выведзены са строю каля чвэрці сельскагаспадарчых угоддзяў Лівана і 50 тысяч зарэгістраваных прадпрыемстваў, што складае каля 60 працэнтаў ад іх агульнай колькасці ў краіне. Эксперты таксама робяць прагноз, што ў раёнах, якія падвяргаюцца абстрэлам, доля ліванцаў, якія жывуць ва ўмовах крайняй галечы, можа падвоіцца. Як вядома, 23 верасня Ізраіль пачаў аперацыю «Стрэлы поўначы» супраць фарміраванняў шыіцкага руху «Хезбала» ў Ліване, падчас якой наносіць масіраваныя ўдары. Днямі прэм'ер-міністр Лівана Наджыб Мікаці заклікаў міжнародную супольнасць да аказання тэрміновай гуманітарнай дапамогі сваёй краіне, якая пацярпела з-за ізраільскіх нападаў.

## Распрацавана тканіна, здольная замяніць кандыцыянер

Інжынеры з Універсітэта Чжэнчжоў (Кітай) і Універсітэта Паўднёвай Аўстраліі (UniSA) распрацавалі тканіну, здольную зніжаць тэмпературу цела і аб'ектаў гарадскога асяроддзя, перадае Euronews. «Здольнасць тканіны паслужыць зніжаць тэмпературу прапануе ўстойлівую альтэрнатыву кандыцыянерам, забяспечваючы эканомію энергіі і зніжаючы нагрузку на электрасеткі падчас анамальнай спякоты», — адзначыў эксперт UniSA Янчжэ Хоў, адзін з аўтараў даследавання, апублікаванага ў часопісе Science Bulletin. Тэсціраванне паказала, што тканіна блакіруе да 97 працэнтаў сонечнага святла і цяпла. Па словах Хоў, у ёй выкарыстоўваецца прынцып радыяцыйнага астуджэння — натуральнага працэсу, пры якім матэрыялы выпраменьваюць цеплыню ў атмасферу. Замеры паказалі, што новая тканіна на 2,3 градуса халаднейшая, чым традыцыйны тэкстыль, і на 6,2 градуса халаднейшая за навакольнае асяроддзе.

# КАНІКУЛЫ? КАНІКУЛЫ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вольнаму часу школьнікаў падчас канікул традыцыйна ўдзяляюць шмат увагі. На момант пачатку адпачынку, а то і раней кожная школа падрыхтавала план мерапрыемстваў у дні канікул.

Як расказалі ў Міністэрстве адукацыі, самым папулярным, бяспечным і беспраблемным для бацькоў відам адпачынку іх дзяцей застаюцца аздараўленчыя лагеры дзённага знаходжання. Толькі ў Мінску такія лагеры змогуць прыняць каля 14 тысяч школьнікаў. Наведванне лагера прадугледжвае розныя актыўнасці і пазнавальныя экскурсіі, спартыўныя мерапрыемствы і развіццёвыя гульні.

Дзеці прадоўжаць займацца любімай справай у клубах па інтарэсах. А могуць свой адпачынак прысвяціць добраўпарадкаванню роднай зямлі. У прыватнасці, старшакласнікам прапануюць стаць удзельнікамі рэспубліканскага праекта «#ЗаДело», дзе справай для сапраўдных патрыётаў стане навядзенне парадку на малой радзіме. У рамках праекта можна таксама наведаць пажылых людзей і дапамагчы ім з нарыхтоўкай агародніны на зіму, напрыклад, даставіць вітамінныя прадукты з восеньскіх кірмашоў.

11 кастрычніка кіраўнік дзяржавы даў старт рэспубліканскай акцыі — «Дай лесу новае жыццё!» Далучыцца да яе можа кожны школьнік і пасадзіць сваё дрэва ў агульным беларускім лесе, дапамагаючы такім чынам аднаўленню ўчасткаў ляснога фонду, якія пацярпеў ад летняй стыхіі.

Канікулы — зручны час для вучняў выпускных класаў задумацца аб сваёй будучыні і вызначыцца з прафесіяй. Дапамагаюць у гэтым дні адчыненых дзвярэй у ВНУ і ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

У першыя лістападаўскія дні ў сценах беларускіх універсітэтаў і каледжаў можна назіраць групы школьнікаў, якія з цікавасцю знаёмяцца з жыццём навучальных устаноў. Старшакласнікі з усіх рэгіёнаў краіны размаўляюць са студэнтамі, выкладчыкамі, задаюць пытанні членам прыёмнай камісіі, наведваюць музеі універсітэтаў і каледжаў.



Наведванне месцаў гістарычнай памяці — яшчэ адзін важны момант адпачынку дзяцей на канікулах. У кожным рэгіёне Беларусі ёсць знакавыя мясціны. Важна, каб дзеці аб іх ведалі, цікавіліся гісторыяй краіны ў цэлым і сваёй малой радзімы ў прыватнасці. Школьнікі з рэгіёнаў — частыя госці сталіцы. У Мінску яны знаёмяцца з экспазіцыямі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, наведваюць Нацыянальную бібліятэку, сталічныя тэатры, іншыя месцы.

Аб тым, як будзе наладжаны восеньскі адпачынак дзяцей у шостай гімназіі Мінска, расказвае **дырэктар установы адукацыі Наталля КАЗАК.**

— У гімназіі вучацца больш за дзве тысячы дзяцей, і, вядома, іх вольны час у канікулы — гэта наш клопат. Запланавана мноства мерапрыемстваў для максімальнай занятасці дзяцей. Хочам зрабіць канікулы актыўнымі і карыснымі. Папершае, на гэты перыяд у гімназіі будзе адкрыты аздараўленчы лагер, які наведаюць больш за сто дзяцей, у асноўным вучні малодшых класаў. Для іх прадугледжаны сняданак, абед і падвячорак. Дзённы сон у рэжыме таксама ёсць.

У лагеры будуць профільныя атрады: тэатральна-танцавальны, ваенна-патрыятычны і спартыўны — дзеці, такім чынам, будуць не толькі атрымліваць асалоду ад адпачынку, але і ўдзельнічаць у цікавых, пазнавальных і карысных мерапрыемствах, — зазначыла дырэктар гімназіі.

Паводле яе слоў, для кожнага класа складзена свая праграма, аб гэтым паклапаціліся класныя кіраўнікі.

Там ёсць і паездкі па гістарычных і памятных мясцінах, экскурсіі ў музеі, пешаходныя экскурсіі па Мінску і гэтак далей. Што датычыцца работы самой гімназіі, то, як і ва ўсіх установах сярэдняй адукацыі краіны, гурткі і секцыі, творчыя майстэрні, спартыўная зала і музейны пакой будуць працаваць у звычайным рэжыме.

Таксама Наталля Казак адзначыла, што для часткі нашых вучняў канікулы стануць часам падрыхтоўкі да чарговага, раённага, алімпіяднага этапу. А для тых, каму трэба падцягнуць веды, арганізаваны дадатковыя занятркі.

Завершацца восеньскія канікулы 3 лістапада. Адукацыйны працэс другой чвэрці пачнецца 4 лістапада і працягнецца да 24 снежня.

Зімовы адпачынак будзе больш працяглым — 14 дзён. На канікулы школьнікі адправяцца 25 снежня 2024 года і вернуцца да заняткаў 8 студзеня 2025 года.

Па традыцыі самай доўгай застаецца трэцяя навучальная чвэрць — амаль тры месяцы — з 8 студзеня да 22 сакавіка. Вясновыя канікулы будуць такімі ж непрацяглымі, як і восеньскія, — восем дзён — з 23 да 30 сакавіка 2025 года.

Чацвёртая чвэрць будзе самай кароткай — з 31 сакавіка да 30 мая. Завяршаюць яе раней 23 мая толькі навучэнцы 9 і 11 класаў.

Самы доўгачаканы і працяглы адпачынак школьнікаў чакае ўлетку. Асноўная маса навучэнцаў будзе адпачываць 92 дні — з 1 чэрвеня да 31 жніўня. Дзевяцікласнікаў у першай дэкадзе чэрвеня чакаюць іспыты за курс базавай школы, таму на вакацыі яны адправяцца на 82 дні — з 11 чэрвеня да 31 жніўня.

Дадатковыя канікулы прадугледжаны для самых маленькіх школьнікаў — 1-2 класаў, а таксама 3 класаў з ліку вучняў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з пяцігадовым тэрмінам навучання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Адпачываць яны будуць сем дзён — з 17 да 23 лютага.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

---

**27 ноября 2024 г.** **№ 9-Н/2024**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

### по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права частной собственности на земельный участок в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение/ вид вещного права | Кадастровые номер, площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку док-ции, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-324 (по генплану), ул. Долгобродская, 7 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002237, 0,0810 га | 20 574,47 | 3 909,15 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 2 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-649 (по генплану), ул. Кузнечная, 22 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002785, 0,0855 га | 29 865,44 | 5 674,43 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 3 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-483 (по генплану), ул. Новаторская, 27 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002939, 0,0840 га | 15 592,06 | 2 962,49 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 4 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-188 (по генплану), ул. Полякова И.Е., 12 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002454, 0,0780 га | 19 865,85 | 3 774,51 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 5 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-485 (по генплану) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002617, 0,0855 га | 14 111,74 | 2 681,23 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 6 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-488 (по генплану) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002617, 0,0840 га | 13 910,14 | 2 642,93 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 7 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-489 (по генплану) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002617, 0,0840 га | 13 910,14 | 2 642,93 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 8 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-491 (по генплану) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002617, 0,0740 га | 12 494,89 | 2 374,03 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 9 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-493 (по генплану) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/частная собственность | 340100000008002617, 0,0740 га | 12 566,14 | 2 387,57 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. **Аукцион состоится 27 ноября 2024 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, **на р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).**

Перечень документов, предоставляемых участником:

4.1 заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам Республики Беларусь – копия паспорта, представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

**6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1 В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2 После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка (в случае предоставления земельного участка в аренду).

7. Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» **с 28 октября по 25 ноября 2024 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

**Контактный телефон +375 232 30-12-46.**
Информация размещена на сайтах:
**www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by,**
газета «Звязда», «Гомельские ведомости»

# КАРУПЦЫЯ Ў НАШАЙ КРАІНЕ ГАЛАВУ НЕ ПАДЫМАЕ

**Пра тое, што гэты від злачынстваў не перавышае 2 % у структуры агульнай злачыннасці, расказаў старшы пракурор па асаблівых даручэннях упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генеральнай пракуратуры Арцём ІГНАЦЕНКА.**

Ён таксама адзначыў, што такіх паказчыкаў пракуратура дасягнула дзякуючы намаганням па стрымліванні і ранняй прафілактыцы. Арцём Ігнаценка паведаміў, што ў 2023 годзе ў Беларусі былі выяўлены 1253 карупцыйныя злачынствы, адказнасці падвергнуты 924 асобы. За дзевяць месяцаў бягучага года ўстаноўлены 720 крымінальна каральных дзеянняў дадзенай катэгорыі і 623 асобы, якія іх учынілі.

Акрамя гэтага, супрацоўнік Генеральнай пракуратуры адзначыў, што пакрыццё шкоды за карупцыйныя злачынствы на працягу апошніх некалькіх гадоў у сярэднім забяспечана на ўзроўні каля 50 %. На маёмасць карупцыянераў у рамках крымінальных спраў накладваецца арышт, вядзецца пошук карупцыйных актываў, у тым ліку за межамі нашай дзяржавы.

Улічваючы разнастайныя фінансавыя рызыкі. Таму пракуратурай наладжана практыка правядзення з праваахоўнікамі і кантралявальнымі органамі сумесных праверак законнасці і эфектыўнасці рэалізацыі праектаў, якія фінансуюцца з бюджэту, а таксама распараджэння ўласнымі сродкамі суб'ектамі гаспадарання дзяржаўнай формы ўласнасці.

«Толькі сёлета органы пракуратуры правялі 565 праверак выканання антыкарупцыйнага заканадаўства. У сувязі з дапушчанымі парушэннямі да адказнасці прыцягнуты больш за дзве тысячы кіраўнікоў і спецыялістаў. У прафілактычных мэтах 216 асоб афіцыйна папярэджаны аб недапушчальнасці правапарушэнняў. Летась і ў мінулым перыядзе гэтага года па выніках пракурорскіх праверак распачата крымінальнае праследаванне па 254 фактах злоўжыванняў. Па патрабаванні пракуратуры арганізатарамі зменена правядзенне парадку 330 працэдур закупак, у якіх выяўлены істотныя парушэнні. Папярэджана непразрыстае, а ў асобных выпадках і адкрыта злачыннае расходаванне сродкаў на агульную суму звыш 50 мільёнаў рублёў», — падкрэсліў Арцём Ігнаценка.

Яшчэ старшы пракурор па асаблівых даручэннях звярнуў увагу на тое, што аналіз вынікаў пракурорскага нагляду дазволіў Генеральнай пракуратуры выступіць з прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства. Такія прапановы накіраваны на мінімізацыю рызык магчымых злоўжыванняў удзельнікамі закупачнага працэсу. У выніку сумеснай работы прыняты новыя раздзелы заканадаўства, якія абмяжоўваюць выкарыстанне ў дзяржаўных закупках кампаній, якія прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за подкуп службовых асоб, а таксама заснавальнікі якіх прыцягваліся да крымінальнай адказнасці за карупцыйныя і некаторыя эканамічныя злачынствы або калі кампанія афіляваная з дзяржаўным заказчыкам, адзначыў пракурор.

## Кожнае другое — хабар

Арцём Ігнаценка заявіў, што практычна палова карупцыйных злачынстваў — гэта хабары. Больш за 70 % выпадкаў подкупу выяўляюцца ў закупачнай дзейнасці, выкананні дагавораў і аказанні іншага заступніцтва камерцыйным структурам. У мінулым і гэтым годзе спынена супрацьпраўная дзейнасць 27 службовых асоб, якія займалі адказныя пасады ў прамысловасці, транспарце, сельскай гаспадарцы, банкаўскім сектары і дзяржаўным кіраванні.

Ён таксама назваў пасады некаторых асоб, якія сталі фігурантамі крымінальных спраў. Паводле яго слоў, крымінальнаму праследаванню былі падвергнуты: былы намеснік міністра транспарту і камунікацый, намеснік міністра энергетыкі, былы міністр сельскай гаспадаркі, першы намеснік старшыні аднаго абласнога выканаўчага камітэта, некалькі дырэктараў буйных прадпрыемстваў краіны.

Старшы пракурор адзначыў, што праваахоўныя органы арыентаваны на выяўленне не адзінкавых фактаў бытавой карупцыі, а злачынных схем у стратэгічных сферах эканомікі і дзяржаўным кіраванні. Пры гэтым да найбольшага карупцыйнага пранікнення схільныя сельская гаспадарка, прамысловасць, гандаль.

Супрацоўнік Генпракуратуры дадаў, што карупцыйныя праявы ў краіне недапушчальныя, а чыноўнікі-карупцыянеры ўяўляюць асаблівую небяспеку для дзяржавы.

«Уцягванню кіруючых кадраў у карупцыйную дзейнасць спрые шэраг праблем: недастатковая эфектыўнасць ведамаснага кантролю, фармальная і безуважная пазіцыя прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання дзяржкампаній, недахопы ў падборы і расстаноўцы кадраў. На аснове прапаноў Генеральнай пракуратуры, унесеных у ліпені 2024 года, урадам краіны прымаюцца меры па ліквідацыі названых недахопаў», — падкрэсліў Арцём Ігнаценка.

## Абнаўленне антыкарупцыйнага заканадаўства СНД

Старшы пракурор удакладніў, што пытанням процідзеяння карупцыі ўдзяляецца ўвага і праз прызму міжнароднага супрацоўніцтва. Пракурорскія работнікі заўважылі, што нярэдка да карупцыі аказваюцца датычныя прадстаўнікі замежных кампаній і прадпрыемствы з доляй замежнага капіталу, якія імкнуцца супрацьзаконным спосабам асвоіць беларускі рынак або захаваць на ім сваю прысутнасць.

«Гэтая акалічнасць пераконвае нас у неабходнасці падтрымання і далейшага развіцця міжнароднага супрацоўніцтва. Асвоены новыя напрамкі ўзаемадзеяння з замежнымі калегамі. Цяпер за межамі краіны мы пераследуем не толькі карупцыянераў — фізічных асоб, але і суб'екты гаспадарання, якія допускаюць у Беларусі подкуп у камерцыйных мэтах. Адпаведная інфармацыя накіроўваецца ў дзяржавы па месцы рэгістрацыі нядобрасумленных кампаній, для прымянення да іх штрафных санкцый», — распавёў Арцём Ігнаценка.

Супрацоўнік Генеральнай пракуратуры адзначыў, што нагляднае ведамства ініцыравала абнаўленне мадэльнага антыкарупцыйнага заканадаўства СНД. Гэта дазволіць выпрацаваць новыя рэгіянальныя стандарты ў барацьбе з карупцыяй і яе прафілактыцы, якія зблізяць падыходы да гэтай дзейнасці практычна на ўсёй постсавецкай прасторы, тым самым супрацоўніцтва стане яшчэ больш эфектыўным.

## Да іх не прымяняецца амністыя

У сваю чаргу, антыкарупцыйная дзейнасць Следчага камітэта ўяўляе сабой паслядоўную і сістэмную работу, якая накіравана на прафілактыку і скарачэнне карупцыйных праяў, зазначыў **следчы па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення працэсуальнага кантролю Цэнтральнага апарату Следчага камітэта Ігар АМЕЛЬЯНЮК.**

Супрацьдзеянне карупцыі, на яго думку, — гэта не толькі работа праваахоўнага блока, але і задача для ўсёй грамадскасці, у тым ліку працоўных калектываў, у якіх павінна быць сфарміравана нецярпімасць да карупцыйных праяў. Следчы лічыць, што сапраўды важна засцерагчы калегу, калі ён страціў прававы арыенцір і ў яго рабоце сталі заўважныя супрацьпраўныя праявы.

Ігар Амельянюк таксама назваў прычыны і ўмовы карупцыйных злачынстваў. Сярод іх, напрыклад, нямэтавае і неэфектыўнае расходаванне фінансавых сродкаў арганізацыі, інакш кажучы, гэта аплата выдаткаў або паслуг, на якія не вылучаліся грошы альбо яны расходаваліся звыш вылучаных лімітаў. Адзначаецца таксама парушэнне парадку арганізацыі і правядзення дзяржаўных закупак, незабеспячэнне належнай аховы таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў і нават парушэнні ў галіне аплаты працы, калі чалавеку неабгрунтавана даплачваюць за сумяшчэнне пасад, за працу ў выхадныя і святочныя дні пры адсутнасці загадаў, неабгрунтавана і залішне кампенсуюць камандзіровачныя выдаткі.

Следчы таксама нагадаў, што дача хабару адносіцца да катэгорыі цяжкіх злачынстваў, тэрмін даўнасці за якія складае дзесяць гадоў, а атрыманне хабару ў асабліва буйным памеры — да асабліва цяжкіх з тэрмінам даўнасці пятнаццаць гадоў.

Атрымліваецца, што службовая асоба, якая ўчыніла калісьці карупцыйнае цяжкае або асабліва цяжкае злачынства, вобразна кажучы, доўгі час будзе знаходзіцца на парахавой бочцы. І, як паказвае практыка, гэтая бочка калісьці абавязкова выбухне.

«Аналізуючы вынікі следчай работы па расследаванні карупцыйных спраў, кожны раз напрошваецца пытанне: чаго дамагліся службовыя асобы, здзейсніўшы такія злачынствы, і ці варта было яно таго?» — удакладніў Ігар Амельянюк. Акрамя таго, ён таксама адзначыў, што да асуджаных за карупцыю асоб, якія займалі дзяржаўныя пасады, не прымяняюцца амністыя, умоўна-датэрміновае вызваленне і замена пакарання больш мяккім.

## Сёлета раскрыта 20 незаконных схем лабіравання інтарэсаў бізнесу

Гэтую інфармацыю паведаміў **начальнік 3-га аддзела першага ўпраўлення Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі (БЭЗ) МУС Дзмітрый ЛАГУН.**

Нядаўна ва ўжытку праваахоўнікаў з'явілася паняцце «сістэмнай дзелавой» карупцыі, супрацьдзеянне якой з'яўляецца адной з прыярытэтных задач для службы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. У дадзеным выпадку паняцце «сістэмнасці» адрозніваецца ад яго звычайнага разумення.

«У пазначаным кантэксце разумеюцца выпадкі, калі прадстаўнікі бізнесу ствараюць выбудаваную схему перадачы хабараў службовым асобам розных суб'ектаў гаспадарання за лабіраванне сваіх інтарэсаў. Сёлета падраздзяленнямі БЭЗ устаноўлена два дзясяткі такіх схем», — распавёў Дзмітрый Лагун.

Начальнік аддзела падкрэсліў, што эфектыўнасць процідзеяння карупцыі прадугледжвае комплексны падыход да вырашэння праблемы. Гэтай з'яве, улічваючы яе высокую грамадскую небяспеку і латэнтнасць, якая ставарае рэальную пагрозу эканамічнай і нацыянальнай бяспецы, у Беларусі ўдзяляецца асаблівая ўвага.

Па названай прычыне распрацавана стратэгія барацьбы з карупцыяй, у якой знайшлі сваё адлюстраванне асноватворныя кірункі дзейнасці, дзе важнае значэнне адведзена грамадскім інстытутам. У поўнай меры процідзейнічаць гэтаму злу сіламі толькі праваахоўных органаў вельмі цяжка, а часам і немагчыма.

«Толькі сфарміраваўшы ў свядомасці нашых грамадзян устойлівае разуменне непрымальнасці карупцыі, далучаючы да гэтай дзейнасці максімальна шырокае кола грамадскіх інстытутаў, мы зможам весці гаворку аб эфектыўнасці процідзеяння гэтай праблеме», — адзначыў Дзмітрый Лагун.

Прадстаўнік МУС звярнуў увагу на важнасць прафілактыкі карупцыі. Калі раней карупцыянераў дазвалялі выявіць выключна механізмы аператыўна-вышуковай дзейнасці, то на сёння велізарную дапамогу дае правільна выбудаваная аналітычная работа з выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў.

«Яны з'яўляюцца не толькі незаменным памочнікам у арганізацыі аператыўных мерапрыемстваў, але і самастойнай крыніцай значнай інфармацыі, якая дазваляе распазнаць пэўныя маркеры, што паказваюць на наяўнасць магчымых карупцыйных рызык, якія потым падвяргаюцца дбайнаму аналізу і праверцы», — падкрэсліў Дзмітрый Лагун.

Ён таксама зрабіў акцэнт на тым, што перад АУС у першую чаргу стаіць задача зберагчы дзяржаўныя сродкі і не дапусціць пранікнення крыміналу ў эканоміку. «Часта прасцей прадухіліць супрацьпраўнае дзеянне, чым разбірацца з яго наступствамі, у тым ліку магчымым пераводам сродкаў за межы краіны», — дадаў начальнік аддзела.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»**
**BELTORGI.BY**
**ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: **ОАО «Гомельский винодельческий завод»** (УНП 400051877) 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10, тел.: +375 (232) 71-38-55 в лице директора Костяна Дмитрия Александровича.

Повторные публичные торги в форме аукциона будут проведены **12 ноября 2024 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| | |
|---|---|
| Предмет торгов | **Здание участка по ремонту и изготовлению ящичной тары (9Б2/к,350/С-114312)** |

Здание с отдельным входом со стороны ул. Ветковская на земельном участке с кадастровым № 340100000001000506 по адресу: г. Гомель, ул. Рогачевская, 10. Без обременений.

Начальная цена предмета торгов – 591 918,76 бел. рубля с НДС. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 27.10.2024 г. 09.00 по 11.11.2024 г. 16.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на счет организатора торгов.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Подробнее на сайте **beltorgi.by.**



**ОКОЛОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**сообщает о проведении 29 ноября 2024 года открытого аукциона**
**по продаже земельного участка на территории Логойского района**

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Околовский сельсовет, д. Чистый Бор, 25, земельный участок с кадастровым номером 623285415101000029, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания жилого дома | 0,4000 | Возможность подключения к электро-снабжению | 6 000,00 | Публикация в газете + 3 543,04 руб. | 600,00 |

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» и Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298.

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет (IBAN) BY53AKBB36006191211090000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка (BIC) AKBBBY2X, код платежа – 04901, получатель – Околовский сельский исполнительный комитет, УНП 600537220, ОКПО 04431582.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов.
2. Представить квитанцию об оплате суммы задатка.
3. Предъявить документ, удостоверяющий личность, либо доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом или по его поручению с государственной организацией по проведению аукционов.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 29 ноября 2024 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Околово, д. 52.**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **26 ноября 2024 года до 17.00.**

Контактные телефоны: **8 (01774) 51-7-35, 57-4-58.**

# Пад дубовымі галінамі стагоддзяў

**Кожнага зацікаўленага падарожніка, які трапляе ў Вялікія Лётцы, што ў Віцебскім раёне, заўсёды сустракаюць дзве знакавыя фігуры — Дук і дуб. Першы традыцыйна пачынае свой краязнаўчы аповед тут, пад раскідзістай кронай велікана. Прапаноўвае гасцям паспрабаваць абняць неабдымны ствол, па якім прырода дзіўна рассыпала імшаныя наросты-барадаўкі. Некалькі стагоддзяў таму ў гэтае месца сілы прыходзілі іншыя людзі, пасля сюды прыйдуць і нашы нашчадкі, а дуб так і застанецца шамацець магутнымі галінамі як праваднік паміж мінулым і сучаснасцю.**



## На высокім беразе

«Во, паглядзі, які вялікі!» — звяртаецца да мяне мясцовы краязнаўца, гісторык, настаўнік і проста добры чалавек Міхась Дук. І дуб-велікан сапраўды ўражвае сваімі памерамі. Па падліках Міхася Леанідавіча, дрэву каля 300 гадоў, але пакуль яно афіцыйна не стала помнікам прыроды. Але гэта і няважна, бо дуб застаецца ў чалавечай памяці, запамінаецца сваёй незвычайнай структурай: яго кара падобная да дробных кавалачкаў шакаладу, якія звычайна застаюцца пад пліткай у бліскучай абгортцы. Лятчанскі край увогуле можна назваць дубовай сталіцай Віцебшчыны, бо іх, маладых і ўжо векавых дрэўцаў, тут шмат.

Вузкая сцежка праз агароды выводзіць да старога будынка. Тут калісь жыў чалавек, які пасадзіў на гэтай зямлі таполю серабрыстую, рэдкі бэз і шэраг іншых незвычайных раслін, — вядомы геабатанік і дэндролаг Уладзімір Адамаў. Выдатны знаўца беларускай флоры жыў у Лётцах у радавым маёнтку на мяжы XIX—XX стагоддзяў. Ён стварыў тут Вялікалятчанскі батанічны сад, дзе вывучаў і вырошчваў расліны. Так, у 1910 годзе ў садзе было 344 віды драўняных, 664 — травяністых і паўхмызняковых раслін, 13 відаў папаратнікаў. Тут былі сабраны расліны з розных месцаў Паўднёвага паўшар'я і акліматызаваныя прадстаўнікі азіяцкай, заходнееўрапейскай і іншых флор. Была ў Адамава і калекцыя раслін-альбіносаў, а напрыканцы 1924 года — цяпліца з 300 відамі экзотаў, пітомнік больш чым з дзвюма тысячамі лекавых раслін і батанічны музей. Асабліва батанік ганарыўся калекцыяй розных сартоў бэзу, што цвіў у маёнтку паперамена на працягу некалькіх месяцаў. У 20-я гады мінулага стагоддзя маёнтак перадалі сельскагаспадарчаму тэхнікуму, як і сад, значная яго частка прадстаўлена ў сучасным Віцебскім батанічным садзе. У розныя гады ў маёнтку жылі дзеці-беспрытульнікі, была школа, майстэрні для заняткаў. Менавіта дзякуючы таму, што будынак пастаянна выкарыстоўваўся, ён змог захавацца да нашых дзён.

«У 1960—1990 гады ў маёнтку размяшчаўся школьны краязнаўчы музей, з якога і пачалося маё захапленне вывучэннем гісторыі роднага краю. Яго кіраўніком быў выдатны чалавек Ізраіль Міронавіч Фрыдман, які змог прывіць мне цікавасць да ўсяго старажытнага. Тут, у музеі, я праводзіў свае першыя экскурсіі. У 1990-я музей быў расфарміраваны, а другі паверх маёнтка, дзе раней размяшчаліся майстэрні Вялікалятчанскай санаторнай школы-інтэрната, аддалі маладым спецыялістам пад інтэрнат», — расказвае Міхась Дук.

Цікава, што краязнаўца таксама застаўся ў насычанай падзеямі гісторыі маёнтка Адамава: будучы музычным кіраўніком і педагогам-арганізатарам у адкрытым з 1997 года дзіцячым доме, ён на працягу чатырох гадоў жыў на другім паверсе сядзібы, у былой кулінарнай майстэрні. Тут нарадзіўся і старэйшы сын Дука Уладзіслаў.

**Вузкая сцежка праз агароды выводзіць да старога будынка. Тут калісь жыў чалавек, які пасадзіў на гэтай зямлі таполю серабрыстую, рэдкі бэз і шэраг іншых незвычайных раслін, — вядомы геабатанік і дэндролаг Уладзімір Адамаў.**



| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-113573 общей площадью 1181,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения.<br>**Обременение:** аренда (23,1 кв. м – по 31.03.2025; 250 кв. м – по 31.12.2024) | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 273 671,02 | 27 300,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144 общей площадью 1212,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/6, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216 | 227 386,14 | 22 700,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 420/С-5927 общей площадью 232,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Железнодорожная, д. 16, наименование – здание конторы, назначение – здание административно-хозяйственное | Площадь – 0,0992 га, кадастровый номер – 441300000011000456 | 106 237,79 | 10 600,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. номером 420/С-33082 общей площадью 1066,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д. 38А, наименование – магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-33277* общей площадью 138,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д. 38, наименование – магазин №51, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-5931 общей площадью 92,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, 4, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 420/С-46997 общей площадью 164,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, д. 2, наименование – магазин № 52, назначение – здание специализированное розничной торговли.<br>***Обременение:** аренда по 07.09.2026 | Площадь – 0,3387 га, кадастровый номер – 441300000010000096 | 1 068 590,59 | 106 800,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли | Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023 | 3 408,00 | 340,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д. 81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли; отопительный котел «Тисом» с инв. номером по бух. учёту 080840 | Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер – 624082004601000184 | 4 222,00 | 420,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. номером 413/С-528 общей площадью 48,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12, наименование – автостанция, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта; капитальное строение с инв. номером 413/С-529 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12/1, наименование – сарай, назначение – здание нежилое | Площадь – 0,0446 га, кадастровый номер – 425255700001000037 | 2 514,00 | 250,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение** с инв. номером по бух. учёту 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада | Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005 | Одна базовая величина | Одна базовая величина |
| 9 | Капитальное строение с инв. номером 410/С-27187 общей площадью 444,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/1, склад, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 410/С-26719 общей площадью 75,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/2, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 410/С-26718 общей площадью 25,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1, наименование – контора склада, назначение – здание административно-хозяйственное.<br>**Обременение:** аренда по 31.12.2024 (размещение антенны и контейнера сотовой связи 36 кв. м) | Площадь – 0,2813 га, кадастровый номер – 420850100001006901 | 17 136,00 | 1 700,00 |

*** Согласно пункту 2 положения о порядке распоряжения неиспользуемым имуществом хозяйственных обществ, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.09.2022 № 330 «О распоряжении имуществом», продажа неиспользуемого имущества на торгах (на аукционе или по конкурсу) либо без проведения торгов может осуществляться в том числе без наличия документов, удостоверяющих государственную регистрацию его создания, возникновения прав, ограничений (обременений) прав на него*

Продаваемое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации.
Рекомендуется проведение осмотра

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН»: р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 25.11.2024 по предмету торгов №_.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **25 ноября 2024 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.10.2024 по 21.11.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06; (017) 240-61-88 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

## Яўген АРЭНДАРЭВІЧ:

# «НЕ ЎСЁ Ў КІНО

**Беларускі саюз кінематаграфістаў цяпер узначальвае кінапрадзюсар Яўген Арэндарэвіч. Вядома, гэта творчая грамадская арганізацыя, — яна хутчэй дзеля людзей, якія маюць дачыненне да канкрэтнай галіны, таму ў нечым умяшчае абавязкі прафсаюза. Але гэтая галіна без людзей немагчымая, якія б тэхналогіі ні прыйшлі ў кіно, творчасць — найперш праява чалавечага духу. Хто і як павінен вызначаць дух беларускага кіно — пра гэта наша размова...**



***— Быў час, калі творчыя саюзы ўплывалі на фарміраванне культурнага асяроддзя ў Беларусі, але ўжо некалькі дзясяткаў гадоў іх роля змянілася, з'явілася шмат скептыкаў: а ці трэба ў наш час наогул быць сябрам творчай арганізацыі? Чым яна можа быць прывабная для кожнага свайго члена?***

— Творчыя саюзы Рэспублікі Беларусь, Беларускі саюз кінематаграфістаў у тым ліку, па-ранейшаму, як і шмат гадоў таму, так і цяпер застаюцца пляцоўкай падтрымання і фарміравання пэўнага культурнага асяроддзя. Уражанне, быццам роля і значэнне саюза змянілася і стала менш значнай, чым калісьці, — гэта вынік сукупнасці шэрагу суб'ектыўных меркаванняў. Саюз і ў мінулым, і ў сучаснасці, і ў будучыні жыў, жывы і будзе жыць. У многіх кірунках. Асабліва ў наш няпросты час, калі зносіны, на жаль, і ў асяроддзі творчых работнікаў часта зводзяцца да фармальных пытанняў: «Як справы?» і «Ці няма якой-небудзь работы? Ці ёсць праект, у якім можна паўдзельнічаць па сваёй спецыяльнасці?» Для скептыкаў асобна даводзім інфармацыю: Беларускі саюз кінематаграфістаў з'яўляецца рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем. Цяпер у кожнай вобласці на базе мясцовых пракатных арганізацый сфарміраваны аддзяленні Беларускага саюза кінематаграфістаў, які закліканы аб'ядноўваць, падтрымліваць і інфармаваць беларускіх кінематаграфістаў аб рабоце і падрыхтоўцы мерапрыемстваў. Саюз кінематаграфістаў выконвае пэўныя функцыі прафесійнага саюза. І гэта вельмі добра, бо дае магчымасць ініцыяваць і рэалізоўваць ініцыятывы заканатворчага характару ў тым ліку.

***— Няўжо ў нашым заканадаўстве нешта яшчэ не было ўлічана?***

— Асноўнымі пастаўшчыкамі заказаў у Рэспубліку Беларусь, звязаными з вытворчасцю фільмаў, з'яўляюцца прадпрыемствы Расійскай Федэрацыі. Наяўнасць такіх заказаў дае магчымасць атрымліваць у Беларусі рэгулярныя падатковыя і валютныя паступленні, мець уласных спецыялістаў у сферы кінавытворчасці, вытворчую базу.

Большасць кваліфікаваных спецыялістаў, якія валодаюць спецыфічнымі навыкамі ў сферы кінавытворчасці, не з'яўляюцца работнікамі па найме, не маюць пастаяннага наймальніка або заказчыка, а зарэгістраваны ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Так, доля членаў здымачнай групы, прадстаўленая ІП, складае ў сярэднім 60—70 працэнтаў. Пры гэтым доля ўзнагароджання ІП у каштарысе фільма складае прыкладна 40—50 працэнтаў. Па прычыне спецыфікі галіны менавіта такія спецыялісты з'яўляюцца асноўным вытворчым рэсурсам і каштоўнасцю для патэнцыяльнага заказчыка.

Аднак на сёння назіраецца пэўная дыспрапорцыя ў падатковай нагрузцы для такіх спецыялістаў Расіі і Беларусі. У расійскіх — 6 працэнтаў ад выручкі для ІП і плацельшчыкаў падатку на прафесійны даход, у беларускіх ІП — 20 працэнтаў ад даходу (пры гэтым расходная частка ў такой дзейнасці практычна адсутнічае). З гэтай прычыны, а таксама з-за пашырэння на тэрыторыі Расіі рэгіянальных вытворчых баз (у шэрагу рэгіёнаў за здымкі фільмаў за кошт мясцовых бюджэтаў выплачваюцца спецыяльныя адлічэнні — рыбейты) наш айчынны вытворца часта не можа канкурыраваць па кошце з расійскім. Акрамя таго, у сувязі з магчымасцю для грамадзян Беларусі атрымаць у Расіі статус плацельшчыка падатку на прафесійны даход і змяншэннем колькасці заказчыкаў у краіне назіраецца адток кадраў з кінасферы. Гэта значыць, спецыялісты кінаіндустрыі пачынаюць працаваць і плаціць падаткі ў Расіі, а наша краіна ў той жа час іх недаатрымлівае.

З 1 кастрычніка дзякуючы намаганням беларускага Саюза кінематаграфістаў уведзены невялікія папраўкі ў заканадаўства, над якім мы працавалі з мінулага года. Згодна з новым палажэннем, спецыялісты двух кірункаў могуць перайсці ў разрад самазанятых. Плаціць падаткі яны будуць не як індывідуальныя прадпрымальнікі, а як самазанятыя спецыялісты. Але двух кірункаў для кінагаліны недастаткова.

Цяпер вядзецца планамерная работа разам з членам прэзідыума Саюза кінематаграфістаў, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Русланам Іосіфавічам Чарнецкім па пашырэнні спіса для ажыццяўлення ў якасці самастойнай прафесійнай дзейнасці для кінематаграфістаў. Гэта няпростая праца, але, я спадзяюся, мы яе адолеем!

Нават паводле гэтай інфармацыі выснова відавочная: саюз патрэбны. Гэта нават без размовы пра вялізную колькасць культурных, асветніцкіх і адукацыйных мерапрыемстваў, якія праводзіць Беларускі саюз кінематаграфістаў. Запланаваны і рэалізуюцца праграмы сумеснай дзейнасці з Міністэрствам культуры, кінастудыяй «Беларусьфільм», Беларускай акадэміяй мастацтваў, фестывалем «Лістапад». Шырокая міжнародная дзейнасць у рамках наведвання фестываляў і адукацыйных устаноў, праходзяць сустрэчы з іншымі творчымі саюзамі, партыямі, ветэранамі і шмат іншых мерапрыемстваў. З гэтай прычыны аматарам развагаў на тэму: «Ці патрэбны Саюз, каму і для чаго?..» — прапаную перавесці рэфлексію ў плоскасць «што я магу зрабіць для Саюза?»

***— Наколькі «людная» гэтая арганізацыя цяпер? Ці ёсць у яе касцяк з асоб, імёны якіх вядомыя ўсёй Беларусі, аўтарытэт якіх высокі і бясспрэчны?***

— Давайце агучым сухія лічбы: на момант правядзення ў ліпені пазачарговага з'езда Беларускага саюза кінематаграфістаў у яго шэрагах было каля 470 чалавек. На сёння саюз аб'ядноўвае 570 членаў. Праведзена рэформа самой структуры саюза: абноўлены склад Праўлення — у яго ўвайшлі 17 вядомых і актыўных прадстаўнікоў беларускага кінематографа. Таксама ўнесены праўкі ў статут самой арганізацыі: прынята палажэнне аб заснаванні Прэзідыума Саюза. У яго ўваходзяць Руслан Чарнецкі, Антаніна Карпілава, Валянціна Сцяпанава, Сяргей Гіргель. Такі парадак арганізацыі работы дае магчымасць абмяркоўваць пытанні і прымаць рашэнні больш аператыўна. Што да вядомых асоб — членамі саюза з'яўляюцца рэжысёры, аператары, сцэнарысты, кіназнаўцы, якія сталі майстрамі сваёй справы і актыўна здымалі кіно ў мінулыя гады.

***— Наколькі развіццё і існаванне гэтага творчага саюза звязана са станам кінагаліны ў Беларусі? (Бо беларускае кіно перажывала розныя этапы сваёй гісторыі, розныя часы, а Саюз быў, у ім кіпелі спрэчкі аб тым, як перадолець крызісныя з'явы, пра што здымаць, як і г. д.) Ці мае арганізацыя ўплыў на бягучыя кінапрацэсы ў Беларусі?***

— Саюз — гэта аб'яднанне творчых асоб, па гэтай прычыне сувязь з агульным станам кінагаліны, безумоўна, ёсць. Пытанне ў тым, якая гэта сувязь: распаўсюджванне якіх настрояў і меркаванняў? Агульная высnova — беларускаму кінематографу ёсць да чаго імкнуцца і куды развівацца. А калі так, то спрэчкі і жарсці, якія кіпелі ў мінулым, не мелі ў дастатковай меры таго канструктыўнага складніка, які адрознівае творчую дыскусію ад крытыканства і міжасобасных канфліктаў. Багаты досвед мінулых гадоў, спроб пераадолення крызісных з'яў, безумоўна, з'яўляецца карысным і ўлічваецца пры ацэнцы агульнага стану беларускага кінематографа і ў рабоце па распрацоўцы шляхоў далейшага развіцця.

Беларускі саюз кінематаграфістаў, будучы арганізацыяй грамадскай, якраз і імкнецца выступаць у ролі мадэратара і звяна, якое злучае ўсіх, хто задзейнічаны ў кінематаграфічным працэсе краіны. Ёсць агульныя тэмы, агульныя мерапрыемствы, і бачанне шляхоў дасягнення галоўных мэт у пераважнай большасці таксама агульнае.

***— Кінавытворчасць у Рэспубліцы Беларусь у асноўным забяспечваецца дзяржавай. Яна, па сутнасці, галоўны прадзюсар, заказчык і асноўная крыніца фінансавання. У дзяржавы свае задачы ў адносінах да гледача (адпаведна, выбар тэм, матэрыялу). І гэта не сённяшняя сітуацыя, так павялося яшчэ з савецкіх часоў. У суседніх краінах сітуацыя на кінарынку змянілася, але ў нас «Беларусьфільм» застаецца галоўнай студыяй краіны — па традыцыі. У чым сіла (ці слабасць) гэтай традыцыі?***

— У дзяржавы, безумоўна, свае задачы. Працэсы дзяржаўнага функцыянавання і планавання рэалізоўваюць пэўныя людзі. Любой дзяржаве ва ўсе часы былі неабходны фільмы, у якіх была б магчымасць звярнуцца да гледача як да грамадзяніна. Глядач мае прыкметы полу і ўзросту, належыць да пэўнай сацыяльнай групы, але акрамя іншага з'яўляецца грамадзянінам. І тут вельмі важна не блытаць абавязкі, правы, асэнсаваны выбар грамадзяніна і рэалізацыю права гледача, індывідуальнасці, асобы, гэта значыць спажыўца кантэнту. Гэта вельмі важная тэма, вартая асобнай гутаркі.

У глядацкай аўдыторыі даволі шырокі доступ да таго, каб задаволіць запыт на забаўляльны кантэнт: два клікі ў пошукавіку — і можна глядзець любы фільм, любой краіны, у любым жанры. Відавочна, што глядач нашай краіны з'яўляецца часткай агульнасусветнай супольнасці спажыўцоў аўдыявізуальных твораў (як бы вульгарна для кагосьці гэта ні гучала).

З улікам гэтых зыходных абставін вельмі важна ўмела пазіцыянаваць сябе ў жорсткай канкурэнтнай барацьбе за глядацкую ўвагу. І тут успамінаецца славутае «сілаю не быць мілаю». Вельмі важна праўдзіва адказаць на пытанні: «Што ты можаш зрабіць лепш за іншых, што можаш зрабіць толькі ты і для каго? У чым унікальнасць тваёй прапановы?». Калі знойдзены адказы на такія пытанні, то становіцца больш зразумелай роля і дзяржавы, і кінастудыі, якая з'яўляецца неад'емнай часткай дзяржаўнай медыйнай сістэмы.

Навошта спрабаваць канкурыраваць за ўвагу ў сегменце забаўляльнага кантэнту, дзе кожны глядач ужо аддаў нечаму перавагу і мае сваіх фаварытаў? Дзяржава і кінастудыя ўзнімаюць і рэалізоўваюць на высокім мастацкім узроўні тэмы дзяржаўнага значэння і маштабу.

У саюза кінематаграфістаў і кінастудыі «Беларусьфільм», як флагмана айчыннай кінаіндустрыі, ёсць і агульныя тэмы для абмеркавання, і агульныя задачы для рэалізацыі. Унікальнасць нашай краіны ў тым, што ў няпросты час кіраўніцтва і народ умее захаваць мір і парадак у сябе дома: чысціня на вуліцах, бесперабойная работа ўсіх галін гаспадарча-прамысловага комплексу, а гэта штодзённы клопат канкрэтных людзей канкрэтных прадпрыемстваў і арганізацый. Менавіта дзякуючы свядомай працы кожнага з нас на вуліцах парадак, няма арганізаванай злачыннасці, вулічных банд, разгулу галечы, наркаманіі і свавольства. Гэта трэба ўмець шанаваць.

Тэмы гістарычнай спадчыны, удзячнасці як папярэднім пакаленням герояў і працаўнікоў, так і цяперашнім, распрацоўваюць айчынныя кінематаграфісты і на базе кінастудыі «Беларусьфільм». Дакументальнае кіно, тэлевізійная публіцыстыка — з гэтым выдатна спраўляюцца калегі, якія працуюць на тэлеканалах (дарэчы, у Беларускім саюзе кінематаграфістаў адкрыта аддзяленне тэлевізійных работнікаў).

Немагчыма аддзяліць ад дасягненняў мастацкіх і пытанне эканамічнай рэнтабельнасці. Сетка пракатнай сістэмы Рэспублікі Беларусь налічвае каля 160 экранаў. Як можна прыцягнуць гледача ў залы, а тым больш зарабіць, мае сэнс удакладніць у профільных спецыялістаў. Але мы памятаем, што не ўсё ў кіно вызначаецца грашыма і эканамічнай выгадай. Гісторыя сусветнага кінематографа ведае прыклады таго, як мастацкія вартасці той ці іншай карціны не заўсёды пацвярджаліся касавымі зборамі.

***— Вы як глядач і прафесіянал раслі і на беларускіх фільмах — і абралі шлях кінапрадзюсара. Гэта вельмі рэдкая для Беларусі прафесія, але наколькі нам патрэбны такія спецыялісты, на што яны маглі б паўплываць?***

— Прадзюсар — гэта не пра грошы. Або дакладней не толькі пра грошы. Гэта найперш пра адказнасць: эканамічную, мастацкую, маральную, палітычную. Менавіта прадзюсар праходзіць шлях ад ідэі да прэм'еры: рэжысёр можа быць прыцягнуты на перыяд здымкаў і падрыхтоўкі, а потым адхілены ад мантажу і запрошаны толькі на прэм'еру. Прадзюсар жа заклікаючы прайсці ўвесь марафон, і ён нясе персанальную адказнасць за тое, што атрымалася ці не атрымалася, пакольку менавіта прадзюсар у большасці выпадкаў запрашае і рэжысёра на праект. У беларускім кінематографе пакуль інстытут прадзюсіравання і персанальнай адказнасці за атрыманы вынік знаходзіцца ў стадыі фарміравання і першапачатковага развіцця. Беларуская акадэмія мастацтваў перыядычна рыхтуе спецыялістаў гэтага профілю, а таму, будзем спадзявацца, у айчыннага кінематографа ёсць перспектывы перамен да лепшага і ў гэтым сегменце кінавытворчасці.

***— Ці ёсць, на ваш погляд, у беларускага кіно свой твар — рысы, якія адрозніваюць яго ад кінематографа іншых краін? Якія традыцыі беларускага кіно вы адзначылі б як пазітыўныя, а што, на ваш погляд, варта было б пакінуць у гісторыі?***

— Некаторыя адметныя рысы, безумоўна, прысутнічаюць. Хтосьці можа іх вызначаць як станоўчыя, хтосьці — як адмоўныя: гэта, калі заўгодна, праявы аднаго і таго ж. Ёсць арыенцір на акадэмічную традыцыю ў выбары тэм і выбар мовы кінаапавядання. Аднак апошнія некалькі гадоў назіраецца тэндэнцыя да больш свабоднага выбару фармату зносін з гледачом. Усё гэта прыкметы таго, што беларускі кінематограф імкнецца не адставаць і арыентавацца ў агульнасусветных трэндах развіцця.

Славу беларускага кіно мінулых гадоў кавалі майстры, якіх адрознівала максімальная патрабавальнасць да сябе як да мастака і да творчага калектыву, які ачольваў рэжысёр. Будзем спадзявацца, слаўныя традыцыі мінулых гадоў будуць мець магчымасць развівацца і сёння. Мерапрыемствы, якія праводзіцца Беларускім саюзам кінематаграфістаў, даюць магчымасць і захаваць традыцыі, і перадаць іх новаму пакаленню творчых работнікаў, і стварыць свае новыя традыцыі.

***— Калі працягнуць размову аб традыцыях 100-гадовага беларускага кіно, то адна з іх адбілася на***

# ВЫЗНАЧАЕЦЦА ГРАШЫМА І ЭКАНАМІЧНАЙ ВЫГАДАЙ»

***«народнай» назве айчыннай кінастудыі. І калі без іроніі, то ў савецкім беларускім кіно на балючую для рэспублікі ваенную тэму было шмат шчырасці і глыбіні, аўтарскага погляду і прафесіяналізму (на розных узроўнях) — гледачы ва ўзросце пра гэта часта ўспамінаюць з настальгіяй. Таму што сучасны «экшн» на экране не заўсёды адгукаецца ў душы болем (хоць ён ёсць ледзьве не на генетычным узроўні ў кожным жыхары Беларусі). Якімі і для каго павінны быць сучасныя фільмы пра вайну, каб гэтая тэма адгукалася, а не была проста фонам для аповеду нейкай гісторыі?***

— Сучасныя тэхналогіі дазваляюць расказваць і раскрываць тэму гераічнага ваеннага мінулага нашага народа на новым узроўні. Прыкладам новага і такога неабходнага падыходу стала сумесная праца кінематаграфістаў Расіі і Беларусі над праектам «У спісах не значыўся» паводле твора Барыса Васільева. Экранізацыя рамана была зроблена яшчэ ў 1990-я гады, але для сучаснага гледача важна расказаць гісторыю на сучаснай кінамове. Прэм'ера гэтага фільма запланавана на 1 мая.

Для параўнання магу сказаць наступнае: песні пра каханне 50 гадоў таму і сёння гучаць па-рознаму. Так і ў кіно: выкананне «пастарому» знойдзе свайго слухача, але для маладога пакалення патрабуецца больш рытмічная і тэхналагічная кінамова. Прыкладам такога ўмелага падыходу да раскрыцця тэмы і ўдумлівага стаўлення да аўдыторыі з'яўляецца творчасць вядомага аператара-пастаноўшчыка Ігара Грынякіна, які здымаў фільмы «Адмірал», «Саюз выратавання», «Сярэбраныя канькі», «У спісах не значыўся». Беларускі Саюз кінематаграфістаў запрасіў Ігара Грынякіна правесці майстар-клас для студэнтаў Акадэміі мастацтваў у рамках міжнароднага фестывалю «Лістапад».

***— Разнастайнасць тэм у беларускім кіно... Мара ці магчымая рэальнасць? У суседніх з намі краінах больш шырокая палітра кінавытворцаў, што ўплывае на жанравую і тэматычную разнастайнасць. Бо людзям у вольны час хочацца атрымліваць розныя эмоцыі: і ўсміхнуцца, і заплакаць, і паспачуваць, і падумаць пра каханне альбо сутнасць жыцця. Ці была б у гэтым сэнсе карысная канкурэнцыя ў кінавытворчасці?***

— Разумная канкурэнцыя, безумоўна, важная і патрэбная для прагрэсу і развіцця ў першую чаргу так званага камерцыйнага кінематографа: там якраз прынята параўноўваць засвоены бюджэт, выдаткі на прасоўванне і рэкламу, боксофіс, зборы і гэтак далей. У творчым асяроддзі існуе здаровая доля сапернiцтва, але тут калі і магчымае параўнанне, то іншага парадку: ці атрымалася ўвасобіць задуму, знайсці агульную мову з творчым калектывам, як крытыкі і гледачы прынялі фільм, наколькі ён прыйшоўся да часу. Так бывае, што фільм не прыняты сёння, але становіцца культавым заўтра.

Разнастайнасць тэм, вядома, важная, але ёсць і паняцце прыярытэтаў. Пячы свой торт, калі, груба кажучы, на паліцы іх і без таго багата, ці знайсці рэцэпт роднага жытняга хлеба, які патрэбен кожны дзень? Гэта ўжо пытанне рэпертуарнай палітыкі і менавіта прадзюсарскіх рашэнняў. Грошы дзяржавы — гэта грошы бюджэту. А бюджэт — гэта грошы народныя, у тым ліку падаткі, зборы і г. д. Быць патрэбным людзям — вось што важна, а тэма і жанр — пытанне да творцаў.

***— Вы як прадзюсар мелі дачыненне да вытворчасці самых розных фільмаў. Нават калі яны здымаліся ў Беларусі, то ўсё роўна былі разлічаны на расійскі рынак. Ці можна знайсці айчынны фільм, з беларускай тэматыкай, менталітэтам, нашымі акцёрамі ў галоўных ролях, каб ён быў цікавы і нам, і гледачам іншых краін? Ці магчыма, каб такі праект быў паспяховым з пункту гледжання бізнесу? Ці з пункту гледжання ўвагі кінафестываляў?***

— Такі фільм, безумоўна, будзе цікавы для фестываляў — у свеце іх вялізная колькасць (каля пяці тысяч). Фестываляў нашмат больш, чым добрых фільмаў. Такі фільм пры належным падыходзе з боку пракатчыкаў, верагодна, будзе цікавы і гледачу краіны. Наколькі такі праект акупіцца і будзе і паспяховым, напрыклад, у пракаце Расіі, — пытанне дыскусійнае. У тэорыі гэта магчыма, але, калі справа датычыцца практыкі, узнікае вялікая колькасць умоў, якія неабходна выканаць хаця б для прэтэнзіі на поспех і ўвагу гледача. Калі задаца мэтай знайсць фільм з такімі крытэрыямі — усё магчыма. Прыклад таму — «Чорны замак», прэм'ера якога адбудзецца падчас адкрыцця фестывалю «Лістапад». У аснове — твор беларускага класіка Уладзіміра Караткевіча, у самім фільме здымаліся і беларускія, і расійскія акцёры. Якой будзе прэм'ера, ацэнка крытыкаў і гледача — убачым. Важны сам факт таго, што беларуская класіка дабралася да экрана, астатняе залежыць ад складнікаў поспеху, а іх шмат. Няхай усё атрымаецца.

З пункту гледжання бізнесу поспехі магчымы. Літаральна гэтым летам у расійскі пракат выйшла карціна «Не адна дома», якая здымалася ў Беларусі, у тым ліку беларускімі кінематаграфістамі. Карціна была прынята гледачом. Камерцыйны поспех дазволіў калектыву ўжо гэтай восенню зняць працяг гісторыі. Цешыць, што многія ўдзельнікі гэтага праекта — члены Беларускага саюза кінематаграфістаў.

***— У Беларусі некалькі гадоў таму ўзнікла паняцце «нацыянальны кінапраект», якое прад'яўляе шэраг патрабаванняў (па частцы матэрыялу, выканаўцаў, вытворцаў і фінансавання). Гэта павінна спрыяць высокай якасці карціны, забяспечыць рэзананс і асаблівую ўвагу глядацкай аўдыторыі. Ці варта вярнуцца да ідэі «нацыянальнага кінапраекта»?***

— Нацыянальны кінематограф — гэта тое, чым ганарыцца любая дзяржава: сваё бачанне свету, своеасаблівае сведчанне перад усёй чалавечай супольнасцю: «Гэта мы, мы такія». А таму неабходнасць захавання самога паняцця і распрацоўкі фільмаў у фармаце «нацыянальнага праекта» вельмі важная. Якой можа быць тэматыка такога праекта, сцэнарый, рэжысёр, акцёры — гэта асобная тэма для абмеркавання.

***— Вядомая практыка адбору кінапраектаў на конкурснай аснове з наступным іх фінансаваннем — ці дае яна плён? Ці можа саюз актывізаваць працэсы ў кінадраматургіі і паўплываць на сцэнарны партфель кінастудыі?***

— Конкурсны адбор пры фінансаванні праектаў не дрэнны і не добры сам па сабе. Пытанне ў тым, што атрымліваецца на выхадзе. Ёсць магчымасць азірнуцца на дзесяцігоддзе конкурснага адбору і зрабіць высновы: можна лепш. А вось што лепш і каму гэта лепш рэалізоўваць — асобная тэма. Бо для таго, каб мастак адбыўся — рэжысёр, аператар, сцэнарыст, — патрэбна практыка. Патрэбны час, грошы, фільмы. І перамены да лепшага ёсць. Дзесяцігоддзе функцыянавання факультэта экранных мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў дае свой плён. Няхай не ў тым аб'ёме і якасці, як уяўлялася на пачатку шляху, але вынікі ёсць: выпускнікі працуюць на тэлевізійных каналах, на кінастудыі.

Колькасць непазбежна пяройдзе ў якасць. Канструктыўна і адказна адбываецца дыялог паміж Міністэрствам культуры, кінастудыяй, акадэміяй, тэлевізійным каналамі. Мы ёсць адно ў аднаго, а таму і глядач не застанецца без харошага і добрага беларускага кіно. Паміж беларускімі саюзам пісьменнікаў і саюзам кінематаграфістаў вядзецца работа па пошуку айчыннай літаратурнай асновы для папаўнення сцэнарнага партфеля. Важна ўмацаваць давер і веру ў свае сілы паміж усімі ўдзельнікамі кінематаграфічнага жыцця краіны.

***— Якім фільмам аддаяце перавагу вы? Якая карціна ўразіла мацней за ўсё апошнім часам і чаму (калі казаць аб кінамастацтве наогул)?***

— Цяпер я працую над ваеннай карцінай, перагледзеў, мусіць, топ-50 фільмаў. Калі хто яшчэ не паспеў паглядзець, то раю «Жыццё цудоўнае», «Аўгустоўскі туман», «Яе звалі Сара», «Служыцельніца заапарка», «На заходнім фронце без перамен», «Хлопчык у паласатай піжаме», «Чэмпіён з Асвенціма», «Фальшываманетчыкі», «Чорная кніга», «Па сумленні».

Сёлета выйшаў ваенны фільм «Адно жыццё», цікавы падыход да зместу заключаецца ў дзяленні на некалькі частак, дзе кожны раздзел прысвечаны асобнаму чалавеку. Спадабалася канцэпцыя «жыццё-гульня», якая адлюстроўваецца ў сінхранізацыі падзей і дзеянняў, што адбываюцца ў адным вымярэнні і маюць прамую сувязь з іншым.

З сучаснага кіно нядаўна пaглядзеў «Каскадзёры». Гэты фільм дазваляе зірнуць на кінапрацэс знутры. Па-першае, на тое, як здымаюцца трукі, экшн-сцэны, наколькі небяспечная, але бясслаўная прафесія каскадзёра і дублёра. Па-другое, перадаецца атмасфера кінапрацэсу, працы мноства людзей, цэйтнот і мітусня на здымачнай пляцоўцы. Па-трэцяе, выдатны фільм у сваім жанры, а таксама даніна павагі тым, хто прыкладае ўсе намаганні на здымках, каб дабіцца рэалізму і відовішчнасці на экране, тым героям, якіх не ведае глядач кіно.

***— Кожны грамадзянін краіны так ці інакш, ужо тым, што плаціць падаткі ў бюджэт, падтрымлівае існаванне айчыннага кіно. І кожны можа чакаць чагосьці для сябе, кожны можа спытаць аб якасці. Ці можна ўявіць зборны вобраз беларускага кінагледача?***

— Беларускі саюз кінематаграфістаў падтрымлівае сувязі з прадстаўнікамі практычных арганізацый краіны. Падчас гутарак, безумоўна, разважаем: хто ходзіць у кіно, як глядзіць, чаму аддаюць перавагу? На мой погляд, беларусы не надта адрозніваюцца ад гледачоў іншых краін: у кіно ходзяць кампаніі падлеткаў, закаханыя пары, людзі сярэдняга пакалення, каб развеяцца пасля работы, ходзяць сем'і — прагляд кіно па-ранейшаму займае значную частку вольнага часу. Зваротная сувязь з гледачом, безумоўна, існуе: і гледачы, і кінематаграфісты зацікаўлены, каб на экране было добрае кіно.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# УСПОМНІЦЬ МАЙСТРОЎ КІНО

**У мастацкай галерэі «Інстытут культуры» адбылася сустрэча з рэжысёрам Яўгенам Сяцько**

**Напярэдадні кінафестывалю «Лістапад» у мастацкай галерэі «Інстытут культуры» адбылася творчая сустрэча з кінарэжысёрам Яўгенам Сяцько. Падчас імпрэзы адбыўся паказ дакументальнага фільма «Віктар Тураў. Дыханне жыцця». У выбары стужкі было шмат сімвалічнага: і тое, што паказ адбываецца ў год, калі святкуецца 100-годдзе беларускага кіно — а Віктар Тураў — адзін з тых, хто стварыў славу гэтага кіно, — і тое, што мерапрыемства прымеркавалі да выставы «Беларускае кіно ў аб'ектыве Міколы Гнісюка», якая праходзіць у галерэі. Так што гледачы, пазнаёміўшыся з кінастужкай, маглі дапоўніць свае ўражанні, разглядаючы цікавыя фотаздымкі, на многіх з якіх — той жа Віктар Тураў. А яшчэ ледзь не паралельна з паказам дакументальнага фільма пра Віктара Турава адбывалася прэм'ера анімацыйнай стужкі, знятай яго дачкой Аленай Туравай — першы беларускі 3D-мультфільм «Песня Сірын».**




Стужка пра легендарнага беларускага кінарэжысёра пабачыла свет у 2016 годзе на студыі «Летапіс». Сцэнарый напісаў вучань Віктара Турава, рэжысёр Аляксандр Анісімаў. У фільме расказваецца пра значныя моманты біяграфіі Турава, можна пабачыць унікальныя кадры з працэсаў здымкаў і ўрыўкі з самiх работ майстра, пачуць каментарыі з вуснаў яго блізкіх і знаёмых. Тлумачыцца, чаму тэма вайны і ваеннага дзяцінства былі такімі важнымі для рэжысёра — ён дзіця вайны, бацьку-партызана расстралялі акупанты, сам з маці і сястрой стаў вязнем фашысцкага канцлагера. «Больш за ўсё мне блізкія такія творы мастацтва, якія, маючы значэнне для многіх, адначасова з'яўляюцца вельмі асабістымі. Я хачу расказаць пра тых, хто выйграў вайну, усведамляючы ўсю яе жорсткасць і ненатуральнасць для чалавека, хто, знаходзячыся побач са смерцю, усё аддаваў для Перамогі».

Віктар Тураў заўсёды ішоў у мастацтве сваім шляхам, парушаючы нечыя стэрэатыпы і чаканні, часам даводзілася ісці на канфлікт, як у выпадку з экранізацыяй рамана Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі», якая выклікала незадавальненне ў чыноўнікаў адсутнасцю пафасу. Цяжкім ударам для рэжысёра стала, калі яго не перавыбралі на пасаду 1-га сакратара Саюза кінематаграфістаў БССР.

Актрыса Алена Барзова, якая выканала ролю Ганны ў экранізацыі «Палескай хронікі» Івана Мележа, успамінае ў кадры, як рэжысёр намагаўся, каб акцёры не проста гралі, а жылі на здымачнай пляцоўцы, каб адчувалі характэр беларускай прыроды, унікальнасць беларускай культуры і імкнуліся данесці гэта да гледача. Мэтай рэжысёра, які здабыў сусветнае прызнанне, было зрабіць, каб беларускі кінематограф стаў пазнавальны ў свеце, меў адметныя нацыянальныя рысы. Дзеля гэтага ён не толькі працаваў сам, але і стварыў у Беларускай акадэміі мастацтваў, колішнім тэатральна-мастацкім інстытуце, адпаведны факультэт і выхаваў цэлую пляяду будучых кінамайстроў.

— Віктар Тураў — унікальная асоба, зрабіў вялікі рывок у разуменні таго, што павінен здымаць нацыянальны кінематограф. Таму што нацыянальны кінематограф — гэта культурны код, па якім нас пазнаюць. У гэтым фільме маёй галоўнай задачай было паспрабаваць аднавіць характар героя, паказаць яго ў хвіліны горасці і радасці, — выказаўся Яўген Сяцько.

Пасля прагляду адбыўся дыялог з гледачамі. Сярод пытанняў прагучала: ці змог бы Віктар Тураў зняць гэткія пранізлівыя фільмы, калі б у дзяцінстве не перажыў вайну? Яўген Сяцько запэўніў, што чалавек такога таленту ўсё адно знайшоў бы сваю тэму, нават у ранніх работах ён адметны, гэта сапраўднае аўтарскае кіно. На пытанне, ці хацеў бы Яўген Сяцько зняць фільм пра каго-небудзь з вядомых замежных рэжысёраў, той адказаў, што найперш трэба здымаць пра сваіх адметных майстроў, не пра кожнага з якіх зняты якасны фільм, папулярызаваць беларускае мастацтва. Гледачы адзначылі вельмі дакладны падбор у фільме архіўных відэа. Сярод адметных артэфактаў — альбом, які захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архівемузеі літаратуры і мастацтва, дзе змешчаны фотаздымкі проб акцёраў на ролі ў фільме «Людзі на балоце».

На пытанне, ці спраўдзілася мара рэжысёра Віктара Турава пра тое, каб беларускі кінематограф стаў пазнавальным у свеце, займеў адметныя рысы, Яўген Сяцько адказаў станоўча. Такія рэжысёры, як Віктар Тураў, Міхаіл Пташук ды іншыя, змаглі ўвасобіць на экране беларускі менталітэт, а іх справу павінны працягнуць маладыя.

На фестывалі «Лістапад», які адкрыецца ўжо хутка, можна будзе пабачыць новыя работы рэжысёра Яўгена Сяцько: гэта стужка «Залатая эпоха «Беларусьфільма», прысвечаная перыяду 1960—1980-х гадоў у беларускім кінематографе, і дакументальны фільм «Сусвет Івана Міско» пра народнага мастака Беларусі, знакамітага скульптара.

**Людміла ІВАНОВА.**

БЕЛАРУСБАНК

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Капитальное строение с инвентарным номером № 451/С-1893 (здание банка) общей площадью 2595,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Дятлово, ул. Комсомольская, д. 2** |
| **Начальная цена продажи** | 799 505,82 (семьсот девяносто девять тысяч пятьсот пять рублей 82 копейки) в том числе НДС по ставке 20 % – 133 250,97 (сто тридцать три тысячи двести пятьдесят рублей 97 копеек) |
| **Сумма задатка** | 79 950,58 (семьдесят девять тысяч девятьсот пятьдесят рублей 58 копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **09.12.2024 в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 16.00 05.12.2024 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307. |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Дополнительные условия** | Объект недвижимости имеет следующие обременения:<br>- часть изолированных помещений переданы в аренду (площадь 83,6 кв. м) и в безвозмездное пользование (площадь 393,9 кв. м);<br>- реализация проводится с условием размещения на площадях объекта недвижимости центра банковских услуг для обслуживания населения (с заключением договора аренды).<br>- Продаже подлежит следующее прочее имущество: циркуляционный насос НЦ63/7.1 (25,07 руб.); устройство АВР (32,65 руб.), теплосчетчик ТЭМ-4 (189,14 руб.), кондиционер настенный Panasonic (129,96 руб.), электросчетчик (5,82 руб.), узел учета и регулирования тепла (218,40 руб.), кондиционер MDV MDSF-12HRN1 (150,70 руб.), система кондиционирования воздуха н. б. и втб TAC024 (652,16 руб.), монометр (4,32 руб.), монометр (4,32 руб.), термометр (2,76 руб.), термометр (2,76 руб.), термометр (2,76 руб.), соединительная коробка (4,68 руб.), счетчик электрической энергии (92,66 руб.), счетчик электрической энергии CE 103 BY R33 043 (84,24 руб.), пожарная сигнализация (1022,29 руб.), ЛВС-кабельная система на 80 портов (1680,00 руб.), кабельная линия связи до РУЭС (20 пар) (1360,00 руб.). Общая стоимость прочего имущества – 5664,69 (пять тысяч шестьсот шестьдесят четыре рубля 69 копеек), с учетом НДС по ставке 20 %. Приобретаются победителем аукциона либо единственным участником аукциона на основании отдельно заключенного договора купли-продажи |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (1563) 24142, +375 (44) 5455954 (A1), +375(29) 1060671 (A1) |
| **Лот № 2** | |
| **Наименование объекта продажи** | **Изолированное помещение с инвентарным номером № 413/D-6058 общей площадью 80,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Свислочский район, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 17-1** |
| **Начальная цена продажи** | 17 568,00 (семнадцать тысяч пятьсот шестьдесят восемь рублей 00 копеек) в том числе НДС по ставке 20 % – 2928,00 (две тысячи девятьсот двадцать восемь рублей 00 копеек) |
| **Сумма задатка** | 1757,00 (одна тысяча семьсот пятьдесят семь рублей 00 копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **09.12.2024 в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 16.00 05.12.2024 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (1513) 33230, +375 (44) 5455954 (A1), +375 (29) 3610248 (A1) |

*Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка до 05.12.2024 на счет № BY69AKBB66708597000020000000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

